ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 33 (2086)
22 красавіка 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НЯХАЙ ЖЫВЕ МАРКСІЗМ-ЛЕНІНІЗМ — ВЕЧНА ЖЫВОЕ ЎСЁПЕРАМАГАЮЧАЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ВУЧЭННЕ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ СТВОРАНАЯ ЛЕНІНЫМ СЛАЎНАЯ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ САВЕЦКАГА САЮЗА!

З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1966 года.

ПЯЦІГОДКА РОСКВІТУ КУЛЬТУРЫ

Сёння — дзень нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна — вялікага правадыра і настаўніка працоўных усяго свету. Гэта радасны, шчаслівы для нас дзень. Ленін жыве ў сэрцах і думках, яго ідэі авалодалі мільёнамі і мільёнамі людзей.

З першых дзён Савецкай улады Ленін шмат увагі і часу аддаваў пытанням культурнага росту працоўных. Уладзімір Ільіч клапаціўся аб пашырэнні сеткі бібліятэк і выданні твораў класікаў зарубежнай і рускай літаратуры, аб росце маладой савецкай кінематаграфіі, літаратуры, арганізацыі радыёвяшчання, аб так званай «манументальнай прапагандзе» сродкамі мастацтва.

Указанні Леніна па пытаннях культуры сталі тэарэтычнай асновай культурнага будаўніцтва ў нашы дні. Ажыццяўленне на практыцы ленінскай праграмы культурнага будаўніцтва, якой няўхільна трымаецца наша партыя, ператварыла СССР у краіну суцэльнай пісьменнасці, дасягненнямі навукі і мастацтва якой захапляецца ўвесь свет.

Рашэнні XXIII з'езда партыі — яркае сведчанне таго, як наша партыя трымаецца ленінскага курсу далейшага паляпшэння дабрабыту, павышэння культурнага ўзроўню народа.

Пяцігодка крочыць па краіне. На фабрыках і заводах, у калгасах і саўгасах, навуковых установах савецкія людзі натхнёна працуюць над ажыццяўленнем новага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі нашай дзяржавы, прынятага XXIII з'ездам КПСС.

Работнікі культуры заўсёды былі і будуць надзейнымі памочнікамі нашай партыі, праваднікамі яе ленінскіх ідэй і планаў. Сёння перад органамі і ўстановамі культуры стаіць важная задача — разгарнуць шырокую і дзейсную прапаганду рашэнняў і матэрыялаў XXIII з'езда КПСС сярод шырокіх працоўных мас. Неабходна глыбока і даходліва растлумачваць палітыку партыі, велічныя намёткі пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі.

Галоўнае ў рабоце культасветустаноў — цесная сувязь з жыццём народа, выхаванне ў савецкіх людзей свядомых адносін да працы як крыніцы росту дабрабыту народа і магутнасці нашай Радзімы. Работнікам культуры трэба рашуча пазбаўляцца фармалізму, уяўнай дзелавітасці, накіроўваць ініцыятыву і энергію савецкіх людзей на канкрэтныя і карысныя справы. Толькі той культармеец будзе на ўзроўні сучасных патрабаванняў, які заўсёды ў пошуку, праяўляе ініцыятыву, не чакае дырэктыў «зверху».

У рэспубліцы нямала ініцыятыўных работнікаў культуры, якія творча ставяцца да выканання сваіх абавязкаў, разумеюць, што ад іх дзейнасці ў многім залежыць і добры настрой і добрая праца савецкага чалавека. У нас ёсць з каго браць прыклад, ёсць у кого вучыцца працаваць. Трэба толькі, каб вопыт лепшых клубаў, дамоў і палацаў культуры, бібліятэк, паркаў, музеяў стаў здабыткам усіх работнікаў культуры.

Важная праблема далейшага развіцця савецкай культуры — паляпшэнне ідэйна-эстэтычнага выхавання працоўных. За апошні час многае зроблена, але яшчэ больш трэба зрабіць.

У рэспубліцы намячаецца добры зрух у гэтай справе. На Гродзеншчыне, у Крупскім, Рэчыцкім і іншых раёнах ажывілася работа самадзейных артыстаў, у калектывы прыходзяць новыя людзі, узнікаюць новыя гурткі па ўсіх жанрах мастацтва. Аддзелы і ўпраўленні культуры, дамы народнай творчасці абавязаны падтрымаць творчы агеньчык у кожным самадзейным калектыве, арганізаваць кваліфікаваную кансультацыю для іх кіраўнікоў, паклапаціцца аб рэпертуары, памагчы набыць касцюмы.

Вялікая роля ў культурным будаўніцтве на вёсцы належыць гораду. Каму, як не дзеячам мастацтва, быць добрымі шэфамі сельскіх самадзейных калектываў. Аб шэфстве ў нас ідзе ўжо гаворка не адзін год. Было многа шуму, парадкасці, а канкрэтных спраў мала. Шэфства творчых арганізацый, тэатраў, музеяў, народных калектываў прадпрыемстваў, будоўляў, транспарту мае на мэце не толькі ўрачыстыя дэкларацыі, але і канкрэтныя справы. Кожны творчы прафесіянальны калектыў павінен мець сваіх «спадарожнікаў» на вёсцы, абавязаны аказваць сістэматычную дапамогу ва ўздыме культуры сельскіх працаўнікоў, у прапагандзе эстэтычных ведаў. Год назад калегія Міністэрства культуры БССР прыняла пастанову па ініцыятыве пінчан, якія распрацавалі канкрэтныя меры па дапамозе сельскім установам культуры. На жаль, пачын пінчан не знайшоў шырокай падтрымкі ў рэспубліцы.

У новай пяцігодцы значна пашыраецца сетка культасветустаноў. Сёлета, напрыклад, у рэспубліцы за кошт дзяржаўных асігнаванняў адкрываюцца 224 новыя сельскія бібліятэкі і 34 клубныя ўстановы на вёсцы, у Століне і Слоніме — паркі культуры і адпачынку, у Салігорску — музей, які адлюструе гісторыю нараджэння першага ў рэспубліцы горада шахцёраў, у Віцебску — мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза, славутага партызана Міная Піліпавіча Шмырова.

За кошт дзяржаўных асігнаванняў будуюцца дамы культуры ў Баранавічах (на 800 месц), Калінкавічах (на 600 месц), Мсціслаўлі і Асіповічах (на 400 месц кожны), цудоўны трохпавярховы будынак абласной бібліятэкі ў Віцебску на 500 тысяч тамоў.

Шырокую праграму будаўніцтва ўстаноў культуры ажыццяўляюць калгасы рэспублікі. Да 50-годдзя Савецкай улады кожная гаспадарка плануе пабудаваць Дом культуры на цэнтральнай сядзібе або клубы ў брыгадах, адкрыць новыя чырвоныя куткі на жывёлагадоўчых фермах. Заслугоўвае ўвагі і падтрымкі ініцыятыва рэчыцкіх калгасаў, якія абавязаліся пабудаваць да знамянальнай даты — 50-годдзя Вялікага Кастрычніка — у кожным вялікім населеным пункце клуб.

Ад калгасаў цяпер паступае столькі заявак, што ў рэспубліцы не хапае падрадных арганізацый, якія б выконвалі заказы на будаўніцтва клубаў. Тармозіць гэту справу і адсутнасць сучасных эканамічных праектаў брыгадных клубаў на 120—150 месц. Белсельпраект, на жаль, не ўлічыў гэтай патрэбы працаўнікоў калгаснай вёскі. Не вырашана яшчэ пытанне з забеспячэннем калгасных аб'ектаў культуры неабходнымі будаўнічымі матэрыяламі, цяжка набыць мэблю і іншае абсталяванне для клубаў і бібліятэк.

Значна больш трэба аддаваць увагі падбору кадраў культасветустаноў. На работу ў клубы, бібліятэкі трэба запрашаць самых дастойных, адукаваных, ініцыятыўных людзей. Веданне жыцця, ідэйная пераканаанасць, адказнасць перад народам не прыйдуць самі, іх трэба выхоўваць. Гэтыя якасці павінны сёння вызначаць кожнага культармейца — актыўнага памочніка партыі ў яе вялікіх планах па пераадоленню істотнай розніцы паміж горадам і вёскай.

Пачэсная справа органаў і ўстаноў культуры — змагацца за няўхільнае выкананне рашэнняў гістарычнага XXIII з'езда КПСС.

У КАМІТЭЦЕ ПА ЛЕНІНСКІХ ПРЭМІЯХ У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ПРЫ САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ СССР

АБ ПРЫСУДЖЭННІ ЛЕНІНСКІХ ПРЭМІЙ ЗА НАЙБОЛЬШ ВЫДАТНЫЯ ДАСЯГНЕННІ Ў ГАЛІНЕ МАСТАЦТВА

Камітэт па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва пры Савеце Міністраў СССР пастанавіў прысудзіць Ленінскія прэміі 1966 года за найбольш выдатныя дасягненні ў галіне мастацтва:

1. Герасімаву Сяргею Васільевічу — за серыю карцін «Зямля руская».

2. Далуханавай Зары (Заруі Агасьеўне) — за канцэртна-выканаўчую дзейнасць (праграмы 1963—1965 г. г.).

3. Закарыядзе Сяргею Аляксандравічу — за выкананне ролі Георгія Махарашвілі ў мастацкім фільме «Бацька салдата».

4. Пластаву Аркадзію Аляксандравічу — за серыю карцін «Людзі калгаснай вёскі».

5. Ульянаву Міхаілу Аляксандравічу — за выкананне ролі Ягора Трубнікава ў мастацкім фільме «Старшыня».

ВЫДАТНЫЯ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

Гутарка з М. С. ЦІХАНАВЫМ — старшынёй Камітэта па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва пры Савеце Міністраў СССР

У гэтым годзе прысуджэнне Ленінскіх прэмій праходзіла пад знакам той вялікай увагі, якая была аказана XXIII з'ездам КПСС дзеячам сацыялістычнай культуры. Цікавасць нашага народа да прысуджэння Ленінскіх прэмій у галіне літаратуры і мастацтва як заўсёды выяўлялася ў шматлікіх зваротах у Камітэт. У іх былі пажаданні самага строгага адбору, выказваліся думкі, якія датычаць як вылучэння кандыдатур, так і агульных прынцыпаў работы Камітэта.

У галіне выяўленчага мастацтва Ленінская прэмія 1965 года прысуджана (пасмяротна) народнаму мастаку СССР Сяргею Васільевічу Герасімаву — за серыю карцін «Зямля руская».

С. Герасімаў — адзін з заснавальнікаў савецкага мастацтва, цудоўны майстар, у карцінах якога з велізарнай сілай паказан рускі нацыянальны характар, рэвалюцыйная накіраванасць.

Высокай прэміяй адзначана серыя карцін «Людзі калгаснай вёскі» народнага мастака СССР Аркадзя Аляксандравіча Пластава. Ён, бадай, адзіны майстар, які прысвяціў сябе адной тэме — паказу жыцця савецкага сяла нашых дзён. Мастак стварыў галерэю цудоўных партрэтаў калгасных працаўнікоў.

Ленінская прэмія прысуджана таксама народнаму артысту СССР Сяргею Аляксандравічу Закарыядзе, выканаўцу ролі Георгія Махарашвілі ў мастацкім фільме «Бацька салдата».

З усяго створанага гэтым акцёрам на сцэне і ў кіно самым вялікім дасягненнем, якое прынесла яму сусветную славу, з'яўляецца вобраз грузінскага селяніна Махарашвілі.

Народны артыст РСФСР Міхаіл Аляксандравіч Ульянаў удастоен Ленінскай прэміі за выкананне ролі Ягора Трубнікава ў мастацкім фільме «Старшыня».

М. Ульянаў — адзін з самых папулярных савецкіх акцёраў кіно і тэатра. Створаны ім вобраз Ягора Трубнікава пераканаўча раскрывае цяжкі, поўны драматызму характар героя. Яго старшыня калгаса — гэта сапраўдны камуніст, для якога барацьба за шчасце народа, за народную праўду складае галоўны сэнс жыцця.

Ленінская прэмія прысуджана і народнай артыстцы РСФСР і Армянскай ССР Зары Далуханавай — за праграмы 1963—1965 гадоў.

Цудоўная прадстаўніца савецкай вакальна-выканаўчай школы, Зара Далуханава ўваходзіць у лік лепшых камерных спявачак свету. Яе рэпертуар уключае вакальную літаратуру, пачынаючы з твораў старадаўніх майстроў і канчаючы навейшымі савецкімі і замежнымі аўтарамі.

Такім чынам, у гэтым годзе савецкае мастацтва прадстаўлена бясспрэчна выдатнымі дасягненнямі самага высокага значэння. На жаль, у галіне літаратуры Ленінская прэмія не прысуджана нікому.

Камітэт па Ленінскіх прэміях перанёс на будучы год разгляд наступных работ:

трыпціх «Салдаты рэвалюцыі» — І. А. Зарыня — у сувязі з тым, што не было магчымасці своечасова азнаёміцца з работай у арыгінале (частка трыпціха знаходзілася на выстаўцы за мяжой);

серыю карцін «Мае землякі» М. Г. Абдулаева — па просьбе аўтара, які працягвае работу над завяршэннем цыкла;

сімфонію № 3 Кара-Караева, з тым, каб даць магчымасць пазнаёміцца з ёй больш шырокаму колу слухачоў;

выкананне В. І. Частнаковым ролі Ул. І. Леніна ў спектаклі «Паміж ліўнямі» ў Ленінградскім акадэмічным тэатры драмы імя А. С. Пушкіна. Аб гэтым прасіла Міністэрства культуры РСФСР, таму што ў намечаны тэрмін не было магчымасці паказаць спектакль у Маскве.

Камітэт па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва выказвае самую сардэчную ўдзячнасць усім савецкім людзям, якія прыслалі свае прапановы і парады.

ТАСС.



Антон БЯЛЕВІЧ

ВЕСНАХОД

Ён па стэпе ішоў,
Ён ішоў праз лясы,
Па далінах,
Цяснінах
І скалах.

Гэткай сілы яшчэ і такое красы
Праз вякі на зямлі не бывала.

Ракатала. Гуло...
Кажуць, гэтак было:
Браў ключы — залатыя праменні,

Адмыкаў,
Адчыняў
Дбайна дзверы ў святло,
У вялікую радасць нам Ленін.

І наперад вядзе ён паўвека амаль
На рубеж запаветны дзяржаву.
Ленін — долі каваль,
Ленін — шчасце каваль,
Ленін — нашая сіла і слава!

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

ПАРТЫІ

З табой мы свой дзень
пачынаем заўсёды,
Як з сонцам, у далі
трымаем разбег.
За нашае сёння,
за шчасце народа
Прыносім падзяку і славу табе.

Пад сцягам тваім
назаўжды ўскаласіла
Сваю нечуваную радасць зямля.
Я веру ў тваю
пераможную сілу,
У твой векапомны,
твой сонечны шлях.

Ты — крылы палёту
імклівага ў заўтра,
Ты — наша надзея,
ты — наша любоў.
І праўда твайго
бальшавіцкага
гарту
Народ у бяссмерце
вядзе за сабой.

ЛЮДЗІ ІДУЦЬ ДА ЛЕНІНА

Чытачы «Правды», разгарнуўшы газету 15 мая 1936 года, маглі ўбачыць паведамленне ўрада. Паведамлялася, што вырашана ў гэты дзень адкрыць Музей Ул. І. Леніна пры Інстытуце Маркса—Энгельса—Леніна. Назаўтра газеты расказалі што адкрыццё музея ператварылася ва ўсенароднае свята, што толькі ў першы дзень яго наведала 12 тысяч чалавек.

А Надзежда Канстанцінаўна Крупская, якая таксама наведала музей, расказвае, як яна, сустрэўшы харкаўскіх рабочых, ператварылася ў экскурсавода.

З таго часу мінула трыццаць гадоў. І літаральна кожны дзень (за выключэннем панядзелкаў) у музей ідуць і ідуць людзі...

Калі я праходзіў па залах у звычайны веснавы дзень, дык налічыў восем вялікіх груп наведвальнікаў, якія слухалі экскурсаводаў. У вестыбюлі чакала яшчэ некалькі груп, экскурсаводаў не хапіла. Дырэктар музея Піліп Далгіх сказаў мне, што ў апошні час штогод тут бывае не менш паўтара мільёнаў чалавек. А за 30 гадоў пабывала 27 мільёнаў.

У першую залу, дзе засяроджаны экспанаты, якія расказваюць пра дзяцінства і юнацкія гады Леніна, я трапіў з групаю школьнікаў сярэдняга ўзросту. Некаторыя з іх ужо былі тут: у гэтай зале іх прымалі ў дзіцячую піянерскую арганізацыю — такая маскоўская традыцыя. Аднак усе ўважліва слухалі экскурсавода. Тое, што маленькі Валодзя Ульянаў вучыўся толькі «на пяцёркі», дзеці ўжо ведалі з падручнікаў. Тут яны ўбачылі гімназічны табель — сведчанне бліскучых здольнасцей і працавітасці Леніна-дзіцяці і падлетка. Але дзеці прыціхлі і сталі асабліва ўважлівыя, калі слухалі расказ пра пяшчотную любоў Валодзі да маці, пра яго любоў і пашану да ўсіх членаў вялікай яго сям'і.

У наступных залах экскурсанты трапляюць ужо ў іншую сферу — у сферу пачатку рэвалюцыйнай барацьбы Леніна, барацьбы за масавы рэвалюцыйны рух, мэта якога — звяржэнне самадзяржаўя. Экспанаты расказваюць пра ўдзел студэнта юрыдычнага факультэта Казанскага універсітэта Ульянава ў рэвалюцыйных студэнцкіх гуртках, пра арганізацыю ім разам з іншымі студэнцкай сходкі, пра першы арышт.

Гэта — пачатак жыцця рэвалюцыянера. З гэтага часу, яго жыццё непарыўна звязана з буйнейшымі грамадскімі і рэвалюцыйнымі падзеямі. Ён — філосаф, палітык, журналіст. Вось адна з першых, што дайшлі да нас, работ Леніна — «Новыя гаспадарчыя рухі ў сялянскім жыцці». Яна і іншыя экспанаты сведчаць аб тым, што ў 23 гады Ленін ужо сфарміраваўся як марксіст-рэвалюцыянер.

Мы прасочваем жыццё Леніна. Яно цяжкае, шматграннае. Падполле, ссылкі, турмы і барацьба ўсюды, заўсёды — усё гэта адлюстравана ў экспазіцыях. Але гэта — фон. А асноўнае, што адчуваеш, разглядаючы экспанаты, — невычэрпны аптымізм, упартая воля Леніна, вера ў народ, сумленнасць, прынцыповасць, непрымірымасць да ворагаў.

У 1970 годзе спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Леніна. Стагоддзе! Яго дыханне такое адчувальнае ў залах музея. Вось зала, дзе адлюстраваны напружаныя дні першай рускай рэвалюцыі. Тут і своеасаблівая карта, якая расказвае пра ўплыў падзей у Расіі на сусветны рэвалюцыйны рух. Францыя: Парыж акружаны мноствам алых успышак, якія азначалі рабочыя стачкі. Стачкі ў Сан-Францыска. Першыя выбухі нацыянальна-вызваленчага руху ў Алжыры, Трыпалі, Егіпце. Гэта паўстагоддзя назад. А ў нашы дні — звыш трыццаці самастойных дзяржаў Афрыкі!

А ў другой зале, у шкляной вітрыне на доўгай жэрдцы — закураныя кацялок і бляшаны чайнік. Унізе ляжыць сякера: Гэтымі рэчамі ў падполлі перад Кастрычнікам 1917 года карыстаўся Ленін, жывучы пад Петраградам у будане. І непадалёку яшчэ экспанаты: два лісткі з блакнота. На іх рукою Уладзіміра Ільіча напісаны тэкст рэзалюцыі ЦК Камуністычнай партыі аб паўстанні.

Рэчы з ленінскага будана былі першымі экспанатамі музея. Іх беражліва хавалі рабочыя Петраграда і ў 30-х гадах перадалі на захоўванне дзяржаве. А варта прайсці трошкі далей, і мы ўбачым адзін з апошніх набыткаў — макет легендарнага крэйсера «Аўрора». Стрэл яго гарматы абвясціў свету нараджэнне Савецкай улады. Побач з макетам карабля — сапраўдны ілюмінатар з крэйсера, які знаходзіцца на вечнай стаянцы ля берагу Нявы. Мне давялося з год назад, будучы ў музеі, убачыць, як гэты ілюмінатар прынёс сюды малады марак з цяперашняй каманды «Аўроры». Я спытаў у марака:

— Хто вас запрасіў сюды?

— Ніхто, — здзіўлена адказаў ён. — Мяне паслала да Леніна каманда...

Так, сюды прыходзяць да Леніна. Тут ленінскі рабочы кабінет — дакладная копія таго, што знаходзіцца ў Крамлі.

У гэтым кабінеце Ленін марыў пра электрыфікацыю Расіі. Герберт Уэлс так і назваў яго: крамлёўскі летуценнік. А ў зале непадалёк — макет адной з буйнейшых гідрастанцый Савецкага Саюза — Волжскай, якая носіць імя вялікага чалавека. У гэтым кабінеце Ленін думаў пра 100 тысяч трактараў для сельскай гаспадаркі краіны, а цяпер на палях калгасаў і саўгасаў працуе звыш мільёна пяцісот тысяч трактараў. У бліжэйшыя пяць гадоў прамысловасць дасць ім 1790 тысяч трактараў.

У канцы доўгага калідора, які падзяляе залы, стаіць аўтамабіль маркі «Ролс-Ройс». На ім Ленін ездзіў у 1921—1922 гадах: айчынных машын тады не было. Цяпер жа толькі ў мінулым годзе савецкія заводы выпусцілі звыш 580 тысяч грузавых і легкавых аўтамабіляў.

Чым бліжэй да нашага часу вядзе экспазіцыя, тым больш мы бачым мемарыяльных экспанатаў, якія без хвалявання нельга разглядаць. Вось сціплае паліто з вузкім аксамітным каўняром. У ім Ленін быў у той трагічны дзень летам 1918 года, калі ў двары завода Міхельсона прагучалі зладзейскія стрэлы. На левым рукаве меткі ад кулі. І месца гэта старанна зацыравана рукою жонкі Уладзіміра Ільіча. Ен хадзіў у гэтым паліто і пасля выздараўлення... А вось і куля, якую вынялі ўрачы толькі ў 1922 годзе. Малюсенькі кавалачак металу, які прынёс столькі гора ўсёй краіне...

Цяжка расказаць пра ўсё, што хвалюе ў гэтым велізарным будынку. 10 тысяч экспанатаў! Велізарная эпоха перад намі, мільгаюць падзеі, якія не раз скаланалі свет...

Мы падыходзім да жалобнай залы, я зноў бачу групу ўжо знаёмых школьнікаў. Яны моўчкі разглядаюць пасмяротную маску. Я успамінаю: толькі што я бачыў членскі білет таварыства «Свбар дзяцей». Ен выдадзены Уладзіміру Ільічу 5 снежня 1923 года. Выдадзены Таварыствам, якое ён сам заснаваў. Бачыў я і «Дэкрэт аб устанаўленні Савета абароны дзяцей», падпісаны ім жа. Дакумент гэты гаворыць пра «абавязак абараніць у небяспечны пераходны час падрастаючае пакаленне, які ляжыць на рэвалюцыйнай уладзе». Варта дадаць, што Савет абароны дзяцей меў амаль неабмежаваныя паўнамоцтвы.

Наведаем яшчэ адну залу. Тут — велізарны глобус, які стракаціць сцяжкамі. Ен дае нагляднае ўяўленне аб тым, як абляцела планету ленінскае слова. Творы вялікага мысліцеля выдадзены 328 464 000 экземплярамі на 64 мовах народаў СССР і 31 — зарубежных народаў. Па дадзеных ЮНЕСКО, сярод перакладной літаратуры кнігі Леніна займаюць першае месца.

...Я пакідаў музей. А ў яго шырока расчыненыя насустрач сонечнаму красавіцкаму дню дзверы ўліваліся патокам усё новыя і новыя наведвальнікі. Тут былі школьнікі і студэнты, рабочыя, якія, як відаць, нядаўна скончылі сваю змену, салдаты і афіцэры Савецкай Арміі. Было і нямала гасцей сталіцы, яны не маглі пакінуць Маскву, хоць гадзінку не пабываўшы «ў Леніна». Вельмі многія, прайшоўшы па музейных залах, накіроўваліся на Красную плошчу, да Маўзалея Ільіча, каб аддаць даніну павагі Чалавеку, мысліцелю, правадыру, празарліўцу цудоўнай будучыні чалавецтва.

Міхаіл АМЕЦІСТАЎ.
(АДН).

З УЗНАГАРОДАЙ

За актыўную навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларускай ССР, крытыка і літаратуразнаўцу прафесара ГУТАРАВА І. В. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

За шматгадовую работу ў партыйных органах і ў друку і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР узнагароджаны таксама намеснік старшыні Камітэта па друку пры Савеце Міністраў Беларускай ССР БАЙКАЧОЎ Р. М.

ВЫСТАЎКІ, ЛЕКЦЫІ, КАНФЕРЭНЦЫІ

«Ленін, партыя, камунізм», — пад такім дэвізам разгортваюць у гэтыя дні сваю работу ўстановы культуры горада Навагрудка.

Асабліва шмат увагі аддае падрыхтоўцы да 50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна гарадская бібліятэка, якой загадвае Н. Шурак.

Бібліятэка шырока прапагандуе матэрыялы XXIII з'езда КПСС. Тут афармлены стэнд, прысвечаны рабоце з'езда, а таксама стэнд «Ул. І. Ленін — заснавальнік КПСС і Савецкай дзяржавы», кніжная выстаўка «Насустрач 50-годдзю Савецкай улады» і іншыя.

Не так даўно ў гарадскім Доме культуры работнікі бібліятэкі правялі тэматычны вечар: «Вялікае шчасце жыць пры камунізме, але вышэйшае шчасце — ствараць яго». Тут жа была праведзена і канферэнцыя чытачоў па рабоце Ул. І. Леніна «Вялікі пачын».

Зараз работнікі бібліятэкі і яе актывісты рыхтуюць канферэнцыю чытачоў на тэму: «Ул. І. Ленін ва ўспамінах сучаснікаў».

А. БЕЛАВУС.

ДЭКАДА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ВА УЗБЕКІСТАНЕ

РУБАБ І ЦЫМБАЛЫ СПЯВАЮЦЬ СУЛАДНА

Гэты фотаздымак — адзін з дакументаў хвалюючага летапісу Дэкады беларускай літаратуры і мастацтва ва Узбекістане. Народныя музыканты вітаюць сваіх дарагіх гасцей. Чыстая, пяшчотная, моцная — як наша дружба — мелодыя ўзляцела высока-высока, у веснавое чыстае неба.

Прыгажун Ташкент, легендарная Бухара, старажытны Самарканд — усюды ў сонечным Узбекістане сёння чутна беларуская гаворка.

— І ўсё гэта мора пачуццяў усхвалявана сёння нашай сустрэчай, сагрэта нашай любоўю і звернута да вас, дарагія нашы госці! Простае і сардэчнае слова «дружба» аднолькава зразумелае, аднолькава дарагое і блізкае ўсім нам, на якой бы мове яно ні вымаўлялася: на рускай, узбекскай ці беларускай,— гаварыў на адкрыцці Дэкады ў Ташкенце першы сакратар ЦК Кампартыі Узбекістана Ш. Р. Рашыдаў.

Гасціннасць узбекскага народа не патрабуе рэкамендацый.

— Тысячы людзей сабраліся сёння ў гэтым палацы, і прывялі іх сюды сэрцы, якія ўмеюць цаніць самае галоўнае ў нашым жыцці — дружбу,— сказала тады ж, на адкрыцці Дэкады, народная паэтэса Узбекістана Зульфія.— Цудоўна, што, адклаўшы часам убок наш старажытны рубаб, мы заслухоўваемся сардэчнымі песнямі Беларусі, светлымі, пяшчотнымі, як прырода яе палёў і лясоў. Сардэчна запрашаем у свой другі дом, у дом сяброў, дзе вы не госці, а проста члены адной вялікай савецкай сям'і.

Хіба могуць пакінуць каго-небудзь раўнадушнымі такія словы. Усхвалявана адказаў таншкенцам народны паэт Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі Пятрусь Броўка.

— Вялікае і сардэчнае дзякуй табе, наш брат Узбекістан, за ласку твайго сонца, за цяпло тваіх сэрцаў! Вялікае прывітанне табе ад тваіх беларускіх братоў і сясцёр, ад тых, хто арэ зямлю, працуе ў цэхах, хто стаіць на варце заходніх рубяжоў нашай Радзімы, ад тых, хто ўслаўляе подзвігі, працу народа — ад музыкантаў, мастакоў, артыстаў, работнікаў кіно і майстроў пяра!

Салом вам сардэчны, гарачы салом, родныя браты і сёстры — баваўнаробы і хлебаробы, работнікі фабрык і заводаў, музыканты, мастакі, артысты, пісьменнікі Узбекістана, якія на ўвесь свет праславілі свой квітнеючы край!

Эмблема Дэкады — два сцягі — Беларускай і Узбекскай ССР, акаймаваныя нацыянальным арнаментам і ўвенчаныя залатой лірай. Дружба наша — у радасцях, у працы, і ў барацьбе.

— Дружба народаў нашай краіны дае нам сілы паспяхова разгорнутым фронтам будаваць светлы будынак камунізма,— сказаў сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч.

...У вясны адвечныя прыкметы: першы зялёны лісток, яркае сонца, пах зямлі, пралескі...

Але ў кожнага года ёсць свая прыкмета вясны.

У шэсцьдзесят шостага — XXIII партыйны з'езд.

— Нацыянальныя і таму надзвычай разнастайныя па форме культуры народаў, якія аб'ядналіся ў братняй сям'і Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, складаюць разам з тым адзіную па свайму сацыялістычнаму зместу культуру, прасякнутую пафасам камуністычнага будаўніцтва, агульнымі клопатамі аб дабрабыце і працвітанні нашай вялікай шматнацыянальнай Радзімы,— гаварыў у дакладзе на з'ездзе Л. І. Брэжнеў.

Сёлетняя вясна дала новыя цудоўныя пацвярджэнні гэтым словам.

ДАРОГАМІ ДРУЖБЫ

Узяўшы старт у сталіцы Узбекістана, Дэкада беларускай літаратуры і мастацтва пачала свой святочны марш па ўзбекскай зямлі. Песня Беларусі паляцела ў госці да баваўнаробаў Ферганы і Самарканда, да чабаноў Харэзма і Бухары, да рыбакоў Арала. Па ўсёй рэспубліцы пралеглі маршруты дружбы, па якіх беларускія пісьменнікі, кампазітары, артысты, мастакі панеслі сваё мастацтва людзям.

У Палац культуры калгаса «Кзыл Узбекістан» Арджанікідзеўскага раёна на сустрэчу з гасцямі з братняй рэспублікі гледачы прыехалі на дзесятках аўтамашын.

Старшыня калгаса, Герой Сацыялістычнай Працы, дэлегат XXIII з'езда КПСС Абдужаміль Маткабулаў горача вітаў артыстаў. Ён расказаў аб поспехах арцелі, адной з перадавых у рэспубліцы.

Калгас мае свой ансамбль, якім кіруе член арцелі заслужаны артыст рэспублікі кампазітар Хакім Мішанаў. На культурныя патрэбы штогод асігнуецца больш 50 тысяч рублёў. «Кзыл Узбекістан» сёлета закладае спартыўны комплекс, будаўніцтва якога будзе каштаваць 800 тысяч рублёў.

Упершыню ў калгасным Палацы культуры прагучалі беларускія цымбалы. Артысты дарэмна хваляваліся, што не знойдуць дарогі да сэрца слухачоў. Усе нумары сустракаліся бурнымі воплескамі, некаторыя нават выконваліся на біс.

Калектыў фірмы «Чырвоная зара» даручыў сустрэць беларускіх гасцей лепшым работнікам. Яны выйшлі за вароты з вялізнымі букетамі бэзу. Паяўленне дэлегацыі на фабрычным двары зблытала ўсе планы: адклалі сеанс у клубным кінатэатры, спынілі заняткі гурткі. Усе выбеглі вітаць пасланцоў Беларусі. А якімі ўдзячнымі былі апладысменты, калі Ул. Алоўнікаў сеў за піяніна, а студэнты Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Л. Кудзеля і В. Пакідчанка заспявалі песню аб Брэсцкай крэпасці.

Такі ж гарачы прыём кампазітарам Ул. Алоўнікаву, Ю. Семяняку, артыстам П. Дружыне і А. Бокаву быў аказаны праз некалькі гадзін у Ташкенцкім электратэхнічным інстытуце сувязі. На гэту сустрэчу прыйшлі і пісьменнікі. Пятрусь Макаль прачытаў напісаны ў Ташкенце верш, прысвечаны гэтаму гораду.

...Над Нукусам некалькі дзён стаялі хмары, ліў дождж, але ў той дзень, калі ў сталіцу Кара-Калпакіі прыляцелі ўдзельнікі Дэкады, у небе ярка заззяла сонца.

У аўтаномнай рэспубліцы памятаюць камуністаў-беларусаў П. Гарадзецкага — удзельніка гераічнай абароны Турту ля. І. Гадзецкага — былога чымбайскага ваенкома, І. Царніцкага — аднаго з чырвоных камандзіраў, які граміў банды басмачоў у нізоўях Аму-Дар'і. А ў далёкім Мазыры пахаваны Герой Савецкага Саюза каракалпак Ж. Калдынараеў, які загінуў, абараняючы мірнае неба Палесся.

Вядомыя людзі Кара-Калпакіі — рыбак калгаса «Камунізм» Аяп Назарханаў, народны паэт Садык Нурумбетаў, настаўніца, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР Рэйма Асенава, народны артыст Узбекскай ССР і Кара-Калпакскай АССР Г. Шыразіева прыйшлі на аэрадром, каб сустрэць беларускіх гасцей.

Прадстаўнікоў братняй рэспублікі вітаў першы сакратар абкома партыі К. Камалаў. Са словам у адказ выступіў Пімен Панчанка.

Удзень беларускія госці знаёміліся са сталіцай рэспублікі, а ўвечары, ў Тэатры імя Станіслаўскага адбыўся вялікі вечар дружбы. На ім прысутнічаў Старшыня Савета Міністраў Узбекскай ССР Р. Курбанаў.

У Сурхандар'інскую і Кашкадар'інскую вобласці накіроўваецца вялікая група беларускіх пісьменнікаў і работнікаў мастацтва. Удзельнікі Дэкады заехалі ў Душанбе—сталіцу братняга Таджыкістана. Госці агледзелі горад, усклалі кветкі да помніка Рудакі і рушылі ў далейшую дарогу. У школе пасёлка Узун, ужо на тэрыторыі Узбекістана, дэлегаты пачулі прамову на роднай мове. Да гасцей звярнулася загадчыца навучальнай часткі мясцовай школы Галіна Суворава. Чатыры гады назад яна скончыла Беларускі універсітэт і выказала жаданне паехаць працаваць у Сярэднюю Азію.

Другая група работнікаў беларускай культуры, якая накіроўваецца ў Андзіжанскую вобласць, перабралася праз Курамінскі хрыбет і спускаецца ў Ферганскую даліну.

На беразе Сыр-Дар'і перад пасланцамі Беларусі нечакана вырас шлагбаум... з кветак. Гэта баваўнаробы калгаса імя Леніна на чале са старшынёй, Героем Сацыялістычнай Працы, дэлегатам XXIII з'езда КПСС Ахметжанам Адылавым выйшлі сустрэць пабрацімаў. Кароткі прыпынак, сяброўскія абдымкі, і дэлегацыя накіроўваецца далей.

На шляху дружбы Каканд — старажытны цэнтр узбекскай культуры, радзіма паэтаў і асветнікаў, горад, якому суджана было стаць пасля Кастрычніка калыскай узбекскага тэатра. Тут удзельнікаў Дэкады ўсхвалявана вітала маленькая дзяўчынка. Гэта была вучаніца чацвёртага класа Максуда Эгамбердыева. Яна напісала верш, прысвечаны Беларусі, і прачытала яго гасцям. На імправізаваным мітынгу выступілі Пятрусь Броўка, Аляксей Русецкі, Юрый і Ганна Дубровіны.

У Дэкадзе беларускага мастацтва ва Узбекістане прымаюць удзел і артысты драматычных тэатраў. Тут тон задае Ташкенцкі рускі драматычны тэатр імя М. Горкага, у якім працуе заслужаны артыст БССР М. Співак. 16 красавіка тэатр паказаў прэм'еру спектакля «Улада цемры» па п'есе Л. Талстога, а 20 і 21 красавіка ў спектаклі выступілі народны артыст БССР Я. Палосін і заслужаная артыстка БССР М. Кузьменка. У Ташкенце чакаюць прыезду народнай артысткі БССР А. Клімавай і заслужанага артыста БССР Р. Янкоўскага. Яны прымуць удзел у спектаклі ташкенцаў «Барабаншчыца», а 25 красавіка ў тэатры зноў прэм'ера: пойдзе спектакль па раману Івана Шамякіна «Сэрца на далоні». Пастаноўку ажыццявіла рэжысёр тэатра С. Чарнова. Пісьменнік даў сваё блаславенне ташкенцкаму варыянту інсцэніроўкі.

Работа Рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага — не адзіны прыклад плённага супрацоўніцтва тэатраў і акцёраў. Цёпла сустрэлі гледачы спектакль па п'есе А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце», які ажыццявіў Кара-Калпакскі тэатр драмы і камедыі. З поспехам ішла ва Узбекістане і камедыя К. Крапівы «Хто смяецца апошнім». У дні Дэкады ўзбекскай літаратуры і мастацтва ў Беларусі ўзбекскія артысты драмы прымуць удзел у спектаклях беларускіх тэатраў.

24 красавіка ўсе чатыры групы дзеячоў беларускай літаратуры і мастацтва, якія выступаюць зараз у гарадах і кішлаках Узбекістана, з'едуцца ў Самарканд. Тут, у старажытнай сталіцы ўзбекаў, адбудзецца вялікае свята беларуска-ўзбекскай дружбы.

М. МАРЦІНКОЎСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

Аматары аўтографаў акружылі Петруся Броўку.

Чытае свае вершы Мікола Аўрамчык.

НАШЫ КЛОПАТЫ, НАШЫ ПАТРЭБЫ

М. ЯСТРАБАЎ,
начальнік Упраўлення па друку Віцебскага аблвыканкома

Справы і думкі ўсіх савецкіх людзей скіраваны сёння на тое, каб паспяхова выканаць велічныя планы новай пяцігодкі. Рашэнні XXIII з'езда партыі горача хвалююць і нас, паліграфістаў. Дырэктывы з'езда прадугледжваюць, напрыклад, у новай пяцігодцы павялічыць тыраж газет, у тым ліку мясцовых, на 40 працэнтаў.

Мы, паліграфісты Віцебшчыны, заклапочаны тым, як забяспечыць своечасовы выхад у свет і добрае паліграфічнае выкананне мясцовых газет з вялікімі тыражамі. Пакуль што з гэтай задачай можа паспяхова справіцца толькі Віцебская абласная друкарня, якая размешчана ў новым будынку і мае неабходнае сучаснае абсталяванне.

У бліжэйшыя гады палепшыцца паліграфічная база раённых друкарань — мы атрымаем ратацыйныя друкарскія машыны з неабходным камплектам стэрэатыпнага абсталявання. Але сёння нам няма дзе размясціць гэта абсталяванне, і мы не можам забяспечыць нармальныя ўмовы для выпуску газет з вялікімі тыражамі ў Полацку, Оршы, Лепелі, Глыбокім, Паставах, Міёрах, Браславе. Друкарні тут размешчаны ў невялікіх памяшканнях і не маюць неабходнай вытворчай плошчы. Трэба падумаць пра будаўніцтва новых друкарань. Але пакуль што гэта пытанне вырашаецца дрэнна. Яшчэ ў 1964 годзе былі адпушчаны сродкі на падрыхтоўку праектнай дакументацыі на рэканструкцыю Полацкай і Аршанскай гарадскіх і будаўніцтва Бешанковіцкай, Сенненскай, Браслаўскай і Верхнедзвінскай раённых друкарань. Для першых чатырох тэхнічная дакументацыя ўжо гатова, але рэканструкцыю і будаўніцтва іх мы пачаць не можам — Полацкай, Аршанскай і Сенненскай друкарням не выдзелены грошы. На будаўніцтва Бешанковіцкай друкарні сёлета адпушчана толькі 16 тысяч рублёў, а трэба — 85 тысяч. Ды і гэтыя сродкі прадугледжаны па нецэнтралізаваных укладаннях і без матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, і на такі аб'ект падрадчыкаў у вобласці не знойдзеш.

Становішча ж у гэтых друкарнях цяжкое. Будынак Полацкай друкарні стары, не адпавядае элементарным тэхнічным і санітарным патрабаванням. Бешанковіцкая друкарня размешчана ў дамку з карыснай вытворчай плошчай 30 квадратных метраў. Тут устаноўлена толькі адна малая плоская друкарская машына, лінатып і некалькі наборных рэалаў. Цесната неверагодная. У такіх умовах цяжка гаварыць пра нармальны выхад газеты. А што ж будзе, калі тыраж гэтай газеты павялічыцца на 40 працэнтаў?.. Прыкладна ў такім жа становішчы і многія іншыя друкарні вобласці.

Калі мы гаворым пра неабходнасць тэрміновага будаўніцтва новых гарадскіх і раённых друкарань, якія адпавядалі б сучасным патрабаванням, мы маем на ўвазе і эканамічны бок справы.

У апошні час правільна ставіцца пытанне аб рэнтабельнасці мясцовых газет. Для гэтага трэба значна ўзняць іх тыражы. Але можна знайсці іншыя шляхі, напрыклад, павялічыць даходы ад выпуску іншай друкаванай прадукцыі. Для гэтага, напрыклад, трэба перавесці на гаспадарчы разлік Пастаўскую, Лепельскую, Лёзненскую, Бешанковіцкую і рад іншых друкарань. Адны з іх размешчаны блізка ад абласнога цэнтра і за кошт шматлікіх заказчыкаў могуць быць загружаны работай, другія знаходзяцца ў вялікіх гарадах і таксама маюць дастатковую колькасць заказчыкаў. Але зрабіць гэта мы пакуль што не можам — з-за адсутнасці патрэбнай вытворчай плошчы магутнасць друкарань абмежаваная. Трэба будаваць вытворчыя памяшканні, якія дазволілі б размясціць неабходнае паліграфічнае абсталяванне.

Не менш важнае значэнне перавод друкарань у новыя вытворчыя памяшканні мае і з пункту гледжання аховы здароўя рабочых. Але каб будаваць, трэба мець тыпавыя праекты новых паліграфпрадпрыемстваў.

Сёння ў фондах Гіпракінапаліграфпраекта СССР для раённых друкарань ёсць адзіны праект коштам будаўніцтва ў 74 тысячы рублёў. Карысная плошча такой друкарні — 472,5 кв. метра, вытворчая плошча — 180,9 кв. метра. Гэты праект можа задаволіць буйныя раённыя цэнтры, дзе друкарні атрымаюць неабходную загрузку, якая адпавядае іх вытворчай магутнасці. Толькі пажадана, каб ён быў больш танны. Бо для меншых раённых цэнтраў (Расоны, Верхнядзвінск) — праект занадта дарагі. З-за адсутнасці загрузкі і няма патрэбы мець тут шмат паліграфічнага абсталявання.

Думаю, няправільна і тое, што праект раённых друкарань заснаваны толькі на скарыстанні жалезабетону ў падмурку і міжпаверхавых столевых перакрыццях. Ні адна з сельскіх будаўнічых арганізацый нашай вобласці гэтых дэталей пакуль што не выробляе. Трэба тэрмінова ўнесці папраўкі, каб для будаўніцтва можна было выкарыстаць камень, лес, цэглу і іншыя мясцовыя матэрыялы.

Утварэнне саюзнага і рэспубліканскага камітэтаў па друку пры Саветах Міністраў адыграла станоўчую ролю ў паляпшэнні выдавецкай справы. За час, што мінуў пасля ўтварэння камітэтаў, многае зроблена па тэхнічнаму аснашчэнню нашых друкарань. Аднак ёсць яшчэ ў нас нявырашаныя праблемы. Час, нарэшце, як след арганізаваць матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне нашых прадпрыемстваў, без чаго немагчыма іх нармальная работа. З заказаных у мінулым годзе 1 300 запасных частак да лінатыпаў мы атрымалі толькі 103. Нам недадалі больш палавіны запасных частак да друкарскіх машын. Не атрымалі ніводнага сантыметра коркавага дэкеля, а таксама сантэхдэталі, металічныя вырабы і многае іншае.

Праблемай па-ранейшаму застаюцца рамонт, мантаж і дэмантаж паліграфічнага абсталявання. І сёння гэтыя работы ў друкарнях нашай вобласці ўскладзены на Маладзечанскі культпрамснабкамбінат. У што абыходзяцца наезды маладзечанскіх рамонтнікаў, можна меркаваць па наступных лічбах. Браслаўская рэдакцыя заплаціла летась за рамонт абсталявання 488 рублёў, Міёрская — 530, па столькі ж — Сенненская. Верхнедзвінская. Такія выдаткі каштарысамі рэдакцый не прадугледжаны. Ды і не заўсёды знойдзецца патрэбны спецыяліст, бываюць выпадкі, калі друкарні прастойваюць па некалькі дзён.

Зразумела, што цяжка працаваць мясцовым паліграфпрадпрыемствам пры такім парадку іх абслугоўвання. Калі ўжо створаны самастойныя камітэты па кіраўніцтву паліграфпрадпрыемствамі, дык трэба, думаецца, перадаць ім і базы забеспячэння, і рамонтныя базы.

Настаў час вырашыць і іншыя пытанні, звязаныя з паляпшэннем работы мясцовых паліграфпрадпрыемстваў. У першую чаргу трэба ўпарадкаваць штатныя расклады раённых друкарань, якія не адпавядаюць узроўню узросшых кваліфікаваных кадраў паліграфістаў, выдзеліць ліміт на жыллёвае будаўніцтва для буйных абласных і гарадскіх друкарань і вырашыць рад іншых пытанняў.

Паліграфічныя прадпрыемствы — матэрыяльна-тэхнічная база нашых газет. Ад узроўню развіцця гэтай базы, ад вытворча-тэхнічнага стану друкарань у раёнах залежыць своечасовы выхад у свет мясцовых газет, іх паліграфічнае афармленне. І трэба ўважліва ставіцца да іх патрэб і клопатаў.

БРАТЭРСТВА

Р. ІНАГАМАЎ,
Т. САЛІХАЎ,
выкладчыкі кафедры літаратуры народаў СССР Ташкенцкага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

ВЯЛІКАЯ Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя зблізіла народы нашай неабдымнай Радзімы, адкрыла шляхі для шчырай дружбы гэтых народаў. Агульнасць мэт, агульная барацьба за будаўніцтва камуністычнага грамадства з'яўляюцца асновай культурных і літаратурных сувязей між народамі Савецкай краіны.

Ці ведаў хто да рэвалюцыі ва Узбекістане пра Беларусь, пра беларусаў і іх літаратуру? Ці ведаў хто ў Беларусі пра старажытную зямлю ўзбекаў, пра культурныя і літаратурныя набыткі нашага народа? Думаецца, ведалі вельмі нямногія. А сёння мы з гордасцю можам гаварыць, што творы ўзбекскіх пісьменнікаў шырока вядомы беларускаму чытачу, а кнігі беларускіх майстроў слова ўвайшлі ў скарбніцу ўзбекскай літаратуры.

Прыкладаў, якія сведчаць аб цесных літаратурных сувязях паміж нашымі народамі, шмат. Узбекскі народ з вялікай цікавасцю сочыць за дасягненнямі брацкай беларускай літаратуры. Творы Янкі Купалы і Якуба Коласа вывучаюцца ў школах і ву нашай рэспубліцы, аматары паэзіі называюць іх аднымі з самых любімых.

У першыя гады Савецкай улады на старонках газет і часопісаў рэспублікі пачалі з'яўляцца вершы і апавяданні беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Гэтыя першыя крокі мелі вялікае значэнне для далейшага развіцця і ўмацавання сяброўскіх сувязей паміж нашымі літаратурамі.

Асабліва ўмацавалася дружба паміж беларускімі і ўзбекскімі пісьменнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У тыя гады разам з рускімі і украінскімі пісьменнікамі А. Талстым, Б. Лаўранёвым, К. Чукоўскім, М. Пагодзіным, М. Бажанам і іншымі жылі ў Ташкенце Якуб Колас і Эдзі Агняцвет. Наш народ прыняў іх па-братэрску гасцінна.

Ташкенцкі перыяд жыцця і творчасці Якуба Коласа складае адну з яркіх старонак непарушнай дружбы паміж нашымі народамі, паміж нашымі літаратурамі.

У Ташкенце Якуб Колас адразу ж стаў адным з актыўных удзельнікаў літаратурнага жыцця нашай рэспублікі. Амаль кожны дзень ён бываў у Саюзе пісьменнікаў. Асабліва клапаціўся ён аб літаратурнай моладзі. Узбекскія паэты вельмі палюбілі Якуба Коласа, раіліся з ім, пыталіся парады. Яны з любоўю называлі беларускага песняра Екуб-ака — брат Якуб. Якуб Колас цікавіўся ўзбекскай народнай творчасцю, збіраў узоры гэтай творчасці. У сваіх артыкулах ён часта расказваў аб лепшых людзях ташкенцкіх заводаў і фабрык, выступаў з гэтымі расказамі па радыё.

У Ташкенце Якуб Колас шмат пісаў. На працягу амаль двух гадоў ён напісаў больш шасцідзесяці вершаў, паэм, апавяданняў, артыкулаў. Многія з іх упершыню ўбачылі свет на старонках ташкенцкіх газет — «Правда Востока» і «Фрунзевец».

У 1942 годзе на ўзбекскай мове выйшлі выбраныя творы Якуба Коласа з прадмовай і пад рэдакцыяй Хаміда Алімджана. Аўтар прадмовы пісаў аб тым, што беларускі паэт стаў родным паэтам і нашага народа: «Тонкі знаўца прыроды і чалавечага сэрца, глыбокі мысліцель Якуб Колас, ад саміх песень якога павявае народнасцю, стаў блізкім, зразумелым і знаёмым і для нашага народа. Узбекістан любіць і разам з усімі народамі нашай Радзімы глыбока паважае яго».

У зборнік было ўключана больш трыццаці вершаў паэта. Узбекскі чытач упершыню пазнаёміўся з імі ў перакладах Г. Гуляма, Міртэміра, Уйгуна, Шайхзада, Зульфіі, Хаміда Гуляма, Тураба Тулы.

Якуб Колас палюбіў узбекскі народ, яго працавітасць, яго гасціннасць, яго доблесць. Паэт, які самааддана любіў родную Беларусь, быў захоплены прыгажосцю нашай прыроды. У такіх вершах, як «Салар», «Чымган», «З вясной», «Узбекістану», «Пры захадзе сонца», пясняр беларускага народа прысвячае шчырыя і цёплыя словы ўзбекскаму народу і яго краіне.

Якуб Колас на доўгія гады пасябраваў з многімі ўзбекскімі літаратарамі, шмат пісаў пра іх творчасць. Яго артыкул «Гафур Гулям» поўны глыбокай павагі і любві да ўзбекскай паэзіі і да нашага народа. «Гафур Гулям... Ён не толькі паэт, ён таксама выдатны мысліцель і філосаф, які адлюстраваў у сабе ўвесь розум і сумленне працалюбівага, чэснага і гераічнага ўзбекскага народа! Калі я гавару пра яго, я ўспамінаю самы вялікі горад Сярэдняй Азіі — Ташкент, зялёныя паркі і бульвары, поўныя чырвоных, белых і тысяч іншых невядомых мне кветак. У паэзіі Гафура Гуляма я бачу прыгажосць Узбекістана, які выхаваў такога паэта, як Гафур Гулям, і роднага таксама і мне», — пісаў Якуб Колас.

Дружбу Эдзі Агняцвет з узбекскай паэтэсай Зульфіяй таксама можна назваць сімвалам дружбы паміж нашымі літаратурамі.

У творах, напісаных беларускай паэтэсай у Ташкенце, знайшлі адлюстраванне жыццё ўзбекскага народа, прырода Узбекістана. Увогуле, нам здаецца, ташкенцкі перыяд аказаў вялікі ўплыў на ўсю творчасць Эдзі Агняцвет. Тут яна напісала і лібрэта оперы «Джанат», якая была пастаўлена на сцэне Тэатра імя Ахунбабаева.

Э. Агняцвет ніколі не забывала Узбекістана. У апошнія гады яна стварыла цыкл вершаў «Узбекскія матывы». Паэтэса шмат робіць для азнаямлення беларускага чытача з дасягненнямі ўзбекскай паэзіі. Ёю перакладзены на беларускую мову творы Гафура Гуляма, Зульфіі, Міртэміра, Уйгуна.

Лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў узбекі чытаюць на сваёй роднай мове. Яны цёпла сустрэлі цудоўны верш Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык» (пераклад Дж. Джабарава), раман П. Броўкі «Калі зліваюцца рэкі» (пераклад Т. Пулата), зборнік вершаў і паэм А. Куляшова «Залатая струна», зборнік вершаў М. Танка. Вершы К. Крапівы, П. Глебкі, А. Астрэйкі, С. Грахоўскага, А. Бачылы, М. Машары і многіх іншых беларускіх паэтаў таксама вядомы ва Узбекістане. У 1951 годзе вершы беларускіх паэтаў былі выдадзены на ўзбекскай мове асобнай кніжкай пад назвай «Брацкія песні» («Кардош кушиклар»). У 1962 годзе выйшаў другі зборнік, у які ўвайшлі вершы больш чым пяцідзесяці беларускіх паэтаў. Іх перакладалі Гафур Гулям, Міртэмір, Шайхзада, Зульфія, Мірмухсін, М. Бабаеў, Маўлан Ікрам, Янгін Мірза, Дж. Джабараў, Э. Вахідаў, З. Абідаў, Х. Шарыпаў, Назармат, Шамансур, А. Арыпаў, Тулкун і іншыя.

У дружбе нашых літаратур адлюстроўваецца дружба нашых народаў. І наша вялікая Радзіма, нашы савецкія людзі моцныя гэтай дружбай.

ДЛЯ АМАТАРАЎ КІНО

Аддзел прапаганды і агітацыі Воранаўскага райкома партыі і раённага аддзялення таварыства «Веды» арганізавалі кінаўніверсітэт. Заняткі ў ім праводзяцца па нядзелях, два разы ў месяц.

На першых занятках лекцыю «Клопаты Камуністычнай партыі аб эстэтычным выхаванні працоўных» прачытаў намеснік дырэктара Воранаўскай сярэдняй школы Б. Буян. Слухачы прагледзелі фільм «Сустрэча з прыгожым».

На кожных занятках дэманструюцца кінафільмы. Савет кінаўніверсітэта плануе арганізаваць сустрэчы слухачоў з артыстамі беларускага кіно.

В. ЗАНКЕВІЧ.

Па слядах казкі

Пачатковая задума была такая: выбраць на Гомельшчыне самую звычайную вёску, пажыць у ёй, сустрэцца са старажыламі, пагаварыць, і тое, што яны раскажуць, пакласці ў аснову будучага нарыса.

Так спачатку я і хацеў зрабіць, і зрабіў бы, калі б у абласным архіве не паказалі мне некалькі старых дакументаў — яны і падказалі мне маршрут па вобласці: вёска Тварычаўка Мазырскага раёна, Рудакоў — Хойніцкага раёна, Зломнае — Жлобінскага.

Калі падрабязна расказваць пра гісторыю гэтых трох вёсак — немінуча давядзецца паўтарацца і ў фактах, і ў інтанацыях. І ў Тварычаўцы, і ў Рудакове, і ў Зломным новыя дамы культуры і клубы, працуюць бібліятэкі, сталовыя, магазіны. На калгасных палях сучаснай тэхнікай кіруюць кваліфікаваныя спецыялісты, дзеці калгаснікаў становяцца ўрачамі і інжынерамі, аграномамі і пісьменнікамі. Пра ўсё гэта нельга гаварыць без гонару. Асабліва, калі ўспомніць, як было: «Цёмная вёска Тварычаўка. Няма ніякіх умоў для культурнай працы. Няма памяшкання, няма літаратуры, няма сродкаў». Іменна гэтая нататка з газеты «Мазырская камсамолія» за 25 кастрычніка 1925 года прывяла мяне ў Тварычаўку.

А Рудакоў, сяло, якое «згодна распараджэння Старшыні Саўнаркома т. Леніна і наркампрода т. Цурупа... прэміравана водпускам тавараў у двайным памеры»? Гэта было ў 1919 годзе і з'явілася адказам на высокую рэвалюцыйную свядомасць рудакоўскіх сялян... Таксама выдатны повад для таго, каб расказаць пра сённяшні дзень сяла.

Або Зломнае — радзіма славутай казкі «Ленінская праўда», якая стала хрэстаматыйнай.

Вельмі хочацца вярнуцца да гісторыі ўсіх трох сёл. Але на гэта трэба час. А таму зараз — толькі пра адну з сустрэч. Зрэшты, гэта звычайная біяграфія, па-мойму, і ёсць гісторыя вёскі Зломнае.

Калі б сказалі Радзівону Архіпавічу Міхальцову гадоў пяцьдзесят назад, што будзе ён вось так спакойна сядзець і расказваць пра сябе, а навокал і дзеці, і дарослыя будуць з пашанаю стаяць і слухаць, што спецыяльна прыедзе паслухаць яго расказ чалавек здалёк — рассмяяўся б, не паверыў. «Наш першы клопат — пракарміцца як-небудзь».

А вось, аказваецца, і працаваць умеў, і ў размове цікавы і разумны. Такія тут людзі, і нездарма іменна тут нарадзілася «Ленінская праўда».

З казкі і пачынаецца наша размова, і адразу Радзівон Архіпавіч заўважае: казка не на голым месцы нараджаецца, яе карэнні — у жыцці, і самаму здольнаму не пад сілу казку стварыць, калі сам не перажыў таго гора і радасці...

«Жылі ў вёсцы два браты. Поле яны аралі, зямлю слязьмі палівалі і гарбы сабе нажывалі. Хлеб і жывёлу ў іх паны забіралі, а плацілі за гэта кулакамі ў спіну», — чытаю я, а Радзівон Архіпавіч кіўкамі галавы ўсё пацвярджае.

— Мастак быў Яўсей Трусаў расказваць, — гаворыць. — Сам так жыў да рэвалюцыі. Ад яго і пайшла гэтая казка.

Вось вытокі казкі — «сам так жыў»...

І Радзівон Архіпавіч, і ўся яго вялікая — шаснаццаць душ — сям'я так жыла.

Я гляджу на Радзівона Архіпавіча — невялікага росту, шчуплы, акуратненькі, вусы пракураныя, твар у цёмных зморшчынах. А рукі — вялікія, натруджаныя, такія карычневыя, што набрынялыя сінія пражылкі ледзь відаць, многа, мабыць, папрацаваў чалавек на сваім вяку.

Пры мне ўзнікла ў Архіпавіча спрэчка з аднагодкам яго Аляксеем Майсеевічам Грыцковым — адкуль назва такая ў вёскі — Зломнае. Адзін расказвае старадаўнюю легенду:

— Пасяліліся тут, ля балот — раней тут кругом балоты былі, — тры браты. А балота зыбаецца, навокал — ні дрэваў, ні кустоў, адна твань чорная. З ламачча пабудавалі сабе браты дом. Вось чаму і называецца — Зломнае.

Другі ўспамінае тое, што на яго памяці было:

— Цяжкое жыццё было, не ладзілася, ламалася... Зломнае...

Памятае сябе Архіпавіч хлапчуком — набегаецца басанож па асенніх лужынах удосталь, потым усю зіму на печы ляжыць. Печ — лепшае месца ў хаце, яно для дзяцей і старых. А сям'я, як ужо гаварылася, шаснаццаць чалавек — сыны не адыходзілі ад бацькі. Тут ужо не да ложкаў — ледзь на падлозе ўмяшчаліся.

Аляксей ЗАРЫЦКІ

ЧАЛАВЕК З БУДУЧЫНІ

Яшчэ дагэтуль высіцца над Волгай дом,
Дзе ўбачыў Ленін белы свет упершыню.
Ды як далёка ўжо сягоння тыя дні,
Калі ён з волжскіх берагоў удалячынь
Юнацкімі вачамі пазіраў.
Уперад, у Наступнае, плывём, плывём
На хвалях дыбістых няўпынлівых гадоў,
І векапомны міг, калі з браневіка
Руку прасцёр прызыўна над Расіяй ён,
Няўхільна аддаляецца ад нас.
Як мала засталося ўжо старых байцоў,
Якія сталі ў строй яшчэ пры Ільічы,
А рысы Леніна усе ясней, ярчэй
У ззянні нашай неадольнай праўды
З гадамі выступаюць, з кожным днём,
Нібыта з будучыні ён на нас глядзіць,
Нібыта з будучыні ён да нас прыйшоў.

Раман ЛУБКІЎСКІ

ІЛЬІЧОЎ ГАДЗІННІК

Аж ляцяць паперкі пад скляпенне:
Воплескі—вясновым капяжом!
На трыбуну Ленін выйшаў. Ленін!
У руцэ—гадзінніка кружок.

Ні адна не прападзе секунда.
Час ідзе па волі Ільіча,
Палыхае стрэлка вастракутная
Водбліскам двухсечнага мяча!

Цішыня.
Суровы, строгі Хронас
Не секундам — лік гадам вядзе.
І праз ніягары бурных хронік
Слухае планета новы дзень.

Выклікае зло на паядынак,
І для ўсіх народаў, нібы кліч,
Б'е гадзіннік.
Б'е набат-гадзіннік,
Той, што над зямлёй завёў Ільіч.

Пераклад з украінскай мовы В. ЗУЁНКА.

У ЛЕНІНІЯНУ

Пра Леніна напісана шмат. Вельмі шмат. На мовах самых розных народаў свету. Праходзяць гады, дзесяцігоддзі, але няўтольная цікавасць да жыцця вялікага стратэга рэвалюцыі і яе чорнарабочага, Чалавека з вялікай літары, які, па словах Горкага, прынёс «сябе ў ахвяру варожасці і нянавісці для здзяйснення справы любві», не толькі не памяншаецца, а з кожным днём расце. Кожны новы год прыносіць усё новыя і новыя творы, аўтары якіх у меру сваіх сіл і таленту стараюцца ацаніць, зразумець значэнне гэтага Чалавека, яго вучэння для гісторыі, для чалавецтва, для сябе.

З такіх твораў складаецца і зборнік «Ленін заўсёды з намі» (ён нядаўна выйшаў у выдавецтве «Беларусь»). Каля сарака апавяданняў, вершаў, урыўкаў з аповесцей і паэм знайшлі месца на яго старонках. Рознымі пісьменнікамі, у розныя гады напісаны яны. Побач з вершамі старэйшын нашай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа стаяць творы пісьменнікаў сярэдняга і малодшага пакаленняў — А. Куляшова, М. Танка, С. Грахоўскага, А. Астапенкі, А. Вялюгіна, Р. Барадуліна, А. Вярцінскага...

Ніхто з аўтараў кнігі не ставіў перад сабой мэты стварыць вобраз Леніна ва ўсёй яго дыялектычнай складанасці, шматграннасці і глыбіні. Ды, урэшце, такая задача, відаць, і не пад сілу аднаму пісьменніку.

Кожны аўтар кнігі проста расказвае пра Леніна, пра свайго Леніна — таго адзінага, непаўторнага, які, як першае каханне, увайшоў у жыццё і застаўся ў ім назаўсёды. У кожнага аўтара Ленін **свой, розны** і ў той жа час **адзіны** — вялікі, мудры, чалавечны. Чалавечая рознабаковасць Леніна, якая паўстае з кнігі, незвычайна вялікая: ад геніяльнага філосафа, на плечы якога гісторыя ўсклала вельмі нялёгкую ношу быць выразнікам адвечных дум і спадзяванняў прыгнечаных людзей усяго свету, да самага звычайнага, простага, зямнога чалавека, нішто чалавечае якому ніколі не было чужое, да якога заўсёды можна было прыйсці, як да самага блізкага сябра — пагаварыць, падумаць, параіцца:

З глыбінь жыватворчых народнага духу
Прыйшоў ён світаннем да нас,
Ён праўду і мудрасць народа падслухаў,
Каб споўніць народа наказ.
Ён зрокам прарочым угледзеў разлогі,
Што людзям нябачны былі.
Ён, Ленін, азначыў, акрэсліў дарогі
У новую праўду зямлі.
(Якуб КОЛАС).

Родны Ленін! Як дораг мне воблік яго.
За ўсіх ён бліжэй...
Я з таго пакалення,
Над калыскай чыёй з першых дзён, з першых год
Клапатліва схіляўся з усмешкаю Ленін.
(Пімен ПАНЧАНКА).

Я Леніна пяю на мове сэрца тых,
Каму і сонца нават мілым не бывала,—
Так рана ўсходзіла, так позна затухала;
Хто ў ноч купальскую, у ноч надзей сваіх
Шукаў у цёмным лесе пад імшыстым голлем
Агеньчык папараці — кветку светлай долі.
Я Леніна пяю...
(Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ).

І паэтычныя, і празаічныя творы, змешчаныя ў кнізе, чытачу ўжо знаёмы. Яны друкаваліся ў перыядычных выданнях, у зборніках, анталогіях. Але сабраныя разам, яны даюць магчымасць яшчэ раз паслухаць біццё гарачага пульсу Кастрычніцкай рэвалюцыі і першых паслярэвалюцыйных год, глыбей адчуць прывабную чалавечую абаяльнасць Леніна, — так, як яе адчулі на сабе падпольшчык Максім, яго жонка і сын на станцыі Разліў (Ілья Гурскі, «Перад бурай»); як яе адчуў Арцём Швайка — стары калгаснік з вёскі Крупляны, у мінулым — салдат рэвалюцыйных войск (Раман Сабаленка, «Пад чырвоным сцягам»); як яе адчулі хлапчукі, што дапамагалі Леніну рамантаваць разбураны масток (Мікола Гамолка, «Ленінскі масток»).

Але разам з тым нельга не спыніцца на некаторых недахопах — і зборніка ў цэлым і паасобных яго твораў. У некаторых творах (у асноўным гэта датычыцца твораў празаічных) заўважаецца імкненне аўтараў «асучасніць» вобразы, прыпісаць сваім героям думкі і словы, якіх яны ў той час, пра які расказвае твор, гаварыць наўрад ці маглі. Гэта адчуваецца, напрыклад, у добрым увогуле, памянёным вышэй, апавяданні І. Гурскага.

У некаторых вершах адчуваецца непатрэбны пах ялею, які так не любіў сам Ленін і якога так баяўся Маякоўскі. Увогуле, пры адборы вершаў, відаць, патрэбна была большая строгасць.

Можна пашкадаваць і аб тым, што ў кнізе малавата ілюстрацый. У зборніку змешчана толькі некалькі фотакопій вядомых работ беларускіх скульптараў і мастакоў: Бембеля, Глебава, Гугеля, Касмачова... Большая колькасць фотаілюстрацый не толькі ажывіла б кнігу, але і больш поўна і аб'ектыўна паказала б тую вялікую цікавасць, якой карыстаецца ленінская тэма ў беларускіх майстроў мастацтва.

А. КУДРАВЕЦ.

«Ленін заўсёды з намі». Склаў Ул. Шыцік. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1966.

НАПЯРЭДАДНІ ПЯТАГА ПІСЬМЕННІЦКАГА

Матэрыялы друкуюцца ў парадку абмеркавання

Вячаслаў РАГОЙША

І ПАНЯСЕ ЯНА ДАР УСЯМУ СВЕТУ

У АРТЫКУЛЕ Я. Семяжона «Праз сваё — да чалавецтва» («Літаратура і мастацтва» ад 22 сакавіка г. г.) асвятляюцца важныя арганізацыйныя і творчыя пытанні, звязаныя са справай перакладу на беларускую мову паэтычных багаццяў іншых народаў свету. Не менш важнай, вельмі неабходнай і надзённай уяўляецца нам і гаворка пра другі бок духоўнага ўзаемаабмену народаў і літаратур — пра пераклады дасягненняў нашай літаратуры на мовы іншых народаў і, вядома, у першую чаргу, на мовы братніх народаў Савецкага Саюза.

Больш пяцідзесяці гадоў назад Максім Багдановіч марыў пра час, калі беларуская літаратура, напоеная сокамі роднай зямлі, набярэцца сілы, узмужнее і панясе свой дар усяму свету. Маўляў, сорамна ўвесь час браць, трэба і самім штосьці ўносіць у скарбніцу сусветнай культуры.

Сёння мы бачым, якім прадбачлівым аказаўся Багдановіч: наша літаратура займае адно з пачэсных месц сярод літаратур братніх рэспублік.

СПАЧАТКУ некалькі лічбаў. У 1963 годзе ў цэнтральных выдавецтвах і выдавецтве «Беларусь» на рускай мове, апрача кніг для дзяцей, выйшла дваццаць кніг нашых пісьменнікаў, у 1964 годзе колькасць іх дасягнула ўжо дваццаці дзевяці. Апрача таго, паасобныя кнігі перакладзены на ўкраінскую, літоўскую, эстонскую, узбекскую, таджыкскую, малдаўскую, грузінскую, кара-калпакскую і якуцкую мовы. Калі ўзяць аналагічныя звесткі за ранейшыя гады, то рост колькасці перакладаў відавочны. Несумненна, павысілася і якасць перакладчыцкай працы. Але пагледзім, як вырашаецца справа з перакладамі ў іншых рэспубліках.

Возьмем, для прыкладу, нашых суседзяў — літоўцаў. Штогод яны выдаюць каля дваццаці кніжак у перакладзе на рускую мову і каля дзесятка кніг літоўскіх пісьменнікаў перакладаецца на мовы народаў Саюза. Або вось Грузія. Толькі ў 1963 годзе ў рэспубліканскіх і саюзных выдавецтвах выйшлі на рускай мове трыццаць тры кнігі грузінскіх пісьменнікаў. Як бачым, у параўнанні з іншымі рэспублікамі (асабліва, калі ўлічваць колькасць насельніцтва) у беларускіх літаратараў з перакладамі справы горшыя.

Што ж перакладзена з беларускай літаратуры за апошнія гады? Гэта, у першую чаргу, творы вядомых нашых празаікаў: раманы «Птушкі і гнёзды» Я. Брыля, «Людзі на балоце» І. Мележа, «Сэрца на далоні» І. Шамякіна, «Сасна пры дарозе» І. Навуменкі, «Сустрэчы на ростанях» А. Кулакоўскага, аповесці В. Быкава «Трэцяя ракета» і «Альпійская балада» (дарэчы, менавіта на творы Быкава прыпадае амаль увесь пералік нярускіх перакладаў беларускай літаратуры), кнігі А. Карпюка, А. Пальчэўскага, Ул. Карпава і інш. За некаторым выключэннем, усё лепшае, створанае празаікамі старэйшага і сярэдняга пакалення ў апошні час, атрымала ўсесаюзную вядомасць. Выключэнне ж датычыць, у асноўным, творчасці маладзейшай плеяды нашых літаратараў. Дагэтуль, напрыклад, на рускай мове няма ніводнага зборніка апавяданняў ці аповесцей Ул. Караткевіча, рускі чытач не ведае і яго арыгінальных раманаў.

Яшчэ горш з перакладамі паэзіі. Наша паэзія—гэта ўжо агульна прызнана — заслугоўвае куды больш шырокага прадстаўніцтва на ўсесаюзнай арэне, чым тыя пяць—шэсць кніг у год, якія выдаюцца ў Маскве. Ды і з гэтых пяці—шасці кніг, у сваю чаргу, толькі якая адна прыпадае на творчасць паэтаў малодшага і сярэдняга пакалення—самай прадукцыйнай кагорты беларускіх паэтаў. Так, у 1963 годзе выйшла толькі кніжка Е. Лось «Купалка», у 1964 — кніга Г. Бураўкіна «Галасы адлегласцей», у 1965—зборнікі вершаў А. Пысіна «Мільён адрасоў» і П. Макаля «Тваё імя»... І гэта ў той час, калі ў «чарзе» ўжо даўно стаяць А. Лойка, Ул. Караткевіч, А. Вольскі, Ул. Нядзведскі, Хв. Жычка, Ю. Свірка, М. Арочка і многія іншыя. Ды што гаварыць пра маладзейшых, калі да сённяшняга дня няма на рускай мове ніводнага больш-менш поўнага зборніка паэзіі А. Александровіча, С. Дзяргая, А. Русецкага, А. Астрэйкі, А. Русака, С. Ліхадзіеўскага і іншых. Безумоўна, выданне паэзіі з яе адносна невысокімі тыражамі — для выдавецтваў справа не вельмі выгадная. Але ж нельга кіравацца толькі камерцыйнымі мэтамі, калі гэта прыносіць шкоду імкненню аднаго народа глыбей і лепш пазнаць душу другога народа.

Яшчэ менш, чым паэзіі, шанцуе пры перакладзе крытыка-літаратуразнаўчым працам. За апошнія гады выйшлі ў Маскве ў перакладзе на рускую мову, здаецца, толькі дзве кнігі — «Станаўленне жанру» А. Адамовіча (пераклад «Беларускага рамана») і «Якуб Колас расказвае...» (у арыгінале — «Колас расказвае пра сябе») М. Лужаніна. А ў беларускім жа літаратуразнаўстве за пасляваенны час назапашана нямала кніг, якія могуць з поспехам увесці ўсесаюзнага чытача ў свет беларускай прозы і паэзіі. Гэта — працы Р. Бярозкіна, Ул. Калесніка, В. Каваленкі і інш.

БЕЗУМОЎНА, гаворачы пра недахопы перакладу той ці іншай катэгорыі беларускіх кніг, можна і трэба прад'яўляць прэтэнзіі да цэнтральных выдавецтваў, да Савета па мастацкаму перакладу пры Саюзе пісьменнікаў СССР і, урэшце, да Маскоўскага савета па беларускай літаратуры, створанага нядаўна. Але ўсё ж, думаецца, — клапаціцца пра папулярызацыю беларускай літаратуры перш за ўсё павінны самі беларускія пісьменнікі, праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Амаль заўсёды атрымліваецца так, што пра творы (нават самыя лепшыя!), якія выходзяць у Беларусі, у іншых рэспубліках даведваюцца толькі тады, калі выдавецтвы гэтых рэспублік самі зацікавяцца імі. Сёлета, напрыклад, на Украіне павінен выйсці з друку томік Максіма Багдановіча, куды, апрача паэзіі, увойдуць і некаторыя артыкулы класіка беларускай літаратуры. Можна смела сцвярджаць, што па нашай «увішнасці» на ўкраінскай мове яшчэ значны час не чыталі б твораў аўтара «Вянка», калі б за гэту справу не ўзяўся аматар беларускай славеснасці дацэнт Львоўскага універсітэта імя І. Франко І. Дзенісюк. Працягваючы памятныя традыцыі І. Свяціцкага па азнаямленню ўкраінскага чытача з беларускай літаратурай, ён арганізаваў ініцыятыўны калектыў перакладчыкаў, дамовіўся з выдавецтвам, напісаў прадмову. Кніга неўзабаве ўбачыць свет. Між іншым, гэта магло б здарыцца намнога раней, калі б належным чынам патурбавалася аб гэтым кіраўніцтва нашага Саюза пісьменнікаў.

Дарэчы, сёлетні і наступны гады — гады юбілеяў Максіма Багдановіча. Але нешта не чуваць, каб асабліва дзе-небудзь рыхтаваліся да гэтых знамянальных дат. Патрэбна, пакуль яшчэ не позна, паслаць ва ўсе саюзныя рэспублікі (і нават за мяжу) артыкулы аб жыцці і творчасці паэта, падрадкоўнікі яго твораў.

ДУМАЕЦЦА, што ўжо даўно пара арганізаваць пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі нейкі спецыяльны орган, які займаўся б выключна справай арганізацыі перакладу твораў з беларускай мовы (і наадварот), справай папулярызацыі лепшых дасягненняў нашай літаратуры за межамі рэспублікі. Ім мог бы стаць рэспубліканскі Савет па мастацкаму перакладу, накшталт таго, які створаны нядаўна ва Узбекістане. Пакуль такога савета няма, яго функцыі, відаць, павінна выконваць праўленне Саюза пісьменнікаў.

На Украіне існуе такая практыка: амаль кожнаму замежнаму госцю-літаратару, які наведвае Кіеў, прапануюць для перакладу на сваю мову які-небудзь твор Тараса Шаўчэнкі. Кніжка «Запавіт» (Кіеў, 1961), у якую ўвайшлі сорак тры пераклады гэтага верша на розныя мовы свету, у значнай ступені папаўнялася менавіта такім шляхам. Чаму б нам не павучыцца ва ўкраінцаў?

Крыўдна і непрыемна гаварыць, але рускі чытач да гэтага часу фактычна не ведае творчасці Кузьмы Чорнага, хоць на рускай мове яго творы выдаваліся не аднойчы! Аднак шмат таго, што вызначае своеасаблівасць, непаўторнасць прозы пісьменніка (рытм, інтанацыя, мелодыка сказа), у перакладах страчана. Вельмі прыблізна ведае рускі чытач і сапраўднае аблічча многіх вершаў і паэм Янкі Купалы, паэм Якуба Коласа «Новая зямля», «Сымон-музыка» і іншых твораў нашай класікі. А многія творы класікаў беларускай літаратуры яшчэ зусім не перакладзены. Даўно ўжо наспела патрэба выдаць на рускай мове падпісныя зборы твораў Купалы, Коласа, Багдановіча, Чорнага. Добрым падарункам для ўсесаюзнага чытача з'явіўся б пераклад на рускую мову «Анталогіі беларускай паэзіі».

ПЕРСПЕКТЫВЫ перакладу літаратуры цесна звязаны са справай выдання беларускіх слоўнікаў. Пасля доўгіх год чакання з'явіўся нарэшце «Беларуска-рускі слоўнік», аднак ён у пэўнай ступені не можа задаволіць патрабаванні перакладчыкаў. Перакладчык «Беларускіх казак» на латышскую мову Юлій Ванаг на нарадзе па пытаннях мастацкага перакладу, што адбылася ў Мінску у канцы мінулага года, справядліва адзначаў, што ў «Беларуска-рускім слоўніку» няма многіх-многіх беларускіх слоў». Але выданне ёмістага перакладнога слоўніка — гэта толькі адзін бок справы. І перакладчыкі, і пісьменнікі, і мовазнаўцы даўно чакаюць шматтомны тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Інстытут мовазнаўства АН БССР толькі пасля вайны складае яго ўжо звыш дваццаці гадоў. Кажуць, праца гэтая вельмі складаная і цяжкая. Аднак жа ў Грузіі ўжо выйшаў з друку сямітомны (у нас плануюць толькі чатырохтомны) тлумачальны слоўнік. Між іншым, І. Насовіч адзін за шаснаццаць гадоў уклаў акрамя іншае працы свой трыццацітысячны «Слоўнік беларускай гаворкі». Дарэчы, яго карысна было б перавыдаць фотаспосабам, як перавыдаюць, напрыклад, слоўнік Б. Грынчанкі ўкраінцы.

Зрэшты, чаму б да распісвання картак для слоўніка не прыцягнуць студэнтаў-філолагаў? Падрыхтоўка слоўніка пасунулася б на шмат шпарчэй. Па меры падрыхтоўкі артыкулаў нядрэнна было б ужо зараз выдаваць асобныя сшыткі — «Матэрыялы для тлумачальнага слоўніка беларускай мовы». Іх папярэдняе абмеркаванне дазволіла б унікнуць некаторых недахопаў і пралікаў пры выданні самога слоўніка.

Кафедра беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта сумесна з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР падрыхтавала і ў 1962 годзе выдала «Польска-беларускі падручны слоўнік». Слоўнік атрымаў высокую ацэнку як у савецкім, так і ў польскім друку. Зараз рыхтуецца аналагічны беларуска-польскі слоўнік. Безумоўна, ён таксама з'явіцца важнай падзеяй у культурным жыцці нашага народа і, несумненна, адчувальна падштурхне справу перакладу беларускай літаратуры на польскую мову, дапаможа зрабіць яе вартай штодзённага клопату польскіх літаратараў.

Нядаўна асобнымі ўкраінскімі вучонымі была выказана думка аб стварэнні ўкраінска-беларускага і беларуска-ўкраінскага слоўнікаў. Хочацца спадзявацца, што гэтая думка знойдзе належны водгалас у асяроддзі і беларускіх мовазнаўцаў і патрэбныя кнігі неўзабаве лягуць на паліцы бібліятэк і кнігарняў. Варта, відаць, падумаць і пра ўкладанне іншых перакладных слоўнікаў, у першую чаргу, стасоўна да моў тых народаў, з якімі Беларусь непасрэдна мяжуе.

У сувязі з усім гэтым хочацца таксама спытаць: ці не настаў час падумаць і пра выданне перакладных слоўнікаў з тых моў, якія вывучаюцца ў нашай сярэдняй школе, на якія ўсё часцей і часцей перакладаюцца творы беларускай літаратуры — беларуска-англійскага, беларуска-французскага, беларуска-нямецкага і адваротных? Відавочна, толькі занядбаннем гэтай справы і можна вытлумачыць той факт, што ў беларускіх школах рэспублікі да сённяшняга дня пры вывучэнні замежных моў даводзіцца карыстацца рускімі падручнікамі, у той час як падручнікі па ўсіх астатніх гуманітарных і прыродазнаўчых дысцыплінах на беларускай мове. З другога боку, адсутнасць, напрыклад, беларуска-англійскага слоўніка вельмі затармажвае непасрэдны пераклад мастацкіх твораў з беларускай мовы на англійскую. Уолтэр Мэй, Бэці Парвін, Вера Рыч, іншыя англійскія перакладчыкі лірыкі Максіма Танка і Аркадзя Куляшова вымушаны перакладаць іх творы не з арыгіналаў, а з рускіх выданняў. І толькі пасля, дзякуючы даволі спраўнай працы пошты, а таксама добрай волі саміх паэтаў і некаторых знаўцаў дзвюх моў, пераклады аўтарызуюцца, выпраўляюцца натуральныя ў такім выпадку недакладнасці. Дарэчы, ці не дапамог бы хоць у некаторай ступені англічанам і неанглічанам спецыяльны падручнік беларускай мовы, накшталт, «Белорусский язык в 25 (30, 50) уроках», «Изучай белорусский язык»? Скласці і выдаць такі падручнік — не лішне вялікі клопат, а карысць ад гэтага была б значная.

Што датычыцца слоўнікаў, то, мабыць, Мінскаму інстытуту замежных моў патрэбна як найхутчэй прыступіць да складання іх картатэк, арганізаваць і цэнтралізаваць падобную працу на дваццаці пяці кафедрах замежных моў іншых вну рэспублікі. У выніках гэтай працы надзвычай зацікаўлены як наша школа, так і многія перакладчыкі-прафесіяналы.

БЕЛАРУСКАЯ літаратура за няпоўных пяцьдзесят гадоў Савецкай улады незвычайна ўзмужнела, набрала разгон, выйшла ў нялёгкую дарогу на міжнародную арэну. І трэба зрабіць усё магчымае, каб тое лепшае, што створана нашым народам, знайшло сваё месца на гэтай дарозе.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ

Заўтра спаўняецца пяцьдзесят гадоў пісьменніку Канстанціну Шнэй-Красікаву. Прэзідыум праўлення Саюза пісьменнікаў БССР накіраваў юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Канстанцін Мікалаевіч!

У дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя прыміце шчырае, братэрскае прывітанне ад пісьменнікаў Савецкай Беларусі.

Мы цэнім Ваш талент літаратара, публіцыста і актыўнага грамадскага працаўніка. Ваш раман «Шумелі Саяны», у якім праўдзіва адлюстраваны перыяд калектывізацыі ў Сібіры, заваяваў заслужаную папулярнасць у чытачоў. Прыемна адзначыць і Вашу працу над п'есамі, прысвечанымі Вялікай Айчыннай вайне і пасляваеннаму жыццю.

Пісьменніцкая грамадскасць ведае Вас і як нястомнага прапагандыста, лектара, здольнага выхавацеля нашай моладзі.

Жадаем Вам, дарагі Канстанцін Мікалаевіч, добрага здароўя, многа год жыцця, творчага натхнення, яшчэ больш актыўнай і плённай работы над новымі творамі».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтых слоў віншавання і таксама жадае юбіляру доўгіх гадоў жыцця і творчых поспехаў.

ВЕЧАРЫ БЕЛАРУСКАГА ГУМАРУ

Нядаўна ў Магілёве ў актавай зале педінстытута адбыўся вечар беларускага гумару і сатыры. З чытаннем гумарыстычных і сатырычных твораў Францішка Багушэвіча, Адама Міцкевіча, Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, Паўлюка Труса, Уладзіміра Корбана, Сяргея Грахоўскага і іншых пісьменнікаў выступіў выкладчык педінстытута Міхась Дзяркач.

Вечары беларускага гумару і сатыры з удзелам М. Дзяркача запланавана таксама правесці ў раённых дамах культуры, у многіх сельскіх і заводскіх клубах вобласці.

ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Больш пятнаццаці год моцная творчая дружба звязвае Вільнюскі дзяржаўны універсітэт імя Капсукаса і Беларускі дзяржаўны універсітэт імя Ул. І. Леніна. Штогод беларускія студэнты бываюць у сваіх літоўскіх сяброў на навуковых канферэнцыях, у час зімовых або летніх канікул. У сваю чаргу госці часта наведваюць Мінск. Стала добрай традыцыяй пры кожнай сустрэчы абменьвацца канцэртамі.

Нядаўна ў БДУ імя Леніна гасцілі студэнты Вільнюскага універсітэта. Пасля сустрэчы ў актавай зале выступіў ансамбль песні і танца Вільнюскага універсітэта. А днямі з Вільнюса вярнулася вялікая група ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці Беларускага універсітэта. Перад літоўскімі студэнтамі выступілі народная харавая капэла, аркестр народных інструментаў, танцавальны калектыў.

А. ЯРОХІН.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»

Глушчанка Г. С. В. Ф. Адоеўскі і руская народная песня. На рускай мове. 1966 г. Тыраж 600 экз., стар. 20. Цана 5 кап.

Клюсаў Г. Н., Юрэвіч А. Л. Сучасная беларуская пунктуацыя. Дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў. 1966 г. Тыраж 4 000 экз., стар. 248. Цана 33 кап.

Мухарынская Л. С. Меладычная мова сучаснай беларускай народнай песні. На рускай мове. 1966 г. Тыраж 600 экз., стар. 56. Цана 12 кап.

Шакун Л. М. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў-завочнікаў. 1966 г. Тыраж 6 000 экз., стар. 83. Цана 12 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Раман Тармола. Поўня. Вершы і паэмы. Мастак В. Майсеенка. 1966 г. Тыраж 3 тыс. экз., стар. 112. Цана 22 кап.

Дзве сястры. Узбекскія народныя казкі. Для сярэдняга ўзросту. Пераклад І. Сакалоўскага. Малюнкі В. Варанецкага. Вокладка М. Гуціева. 1966 г. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 240. Цана 45 кап.

Пятрусь Макаль. Хлопчык будзіць сонца. Вершы. Для малодшага ўзросту. Мастак М. Бельскі. 1966 г. Тыраж 16 тыс. экз., стар. 32. Цана 10 кап.

Аркадзь Марціновіч. Неадкрыты востраў. Апавяданні. Для малодшага ўзросту. Малюнкі М. Пракапенкі. 1966 г. Тыраж 16 тыс. экз., стар. 52. Цана 7 кап.

НЕКАЛЬКІ «ЧАМУ» АМАТАРА ПАЭЗІІ

Поспехі беларускай літаратуры і, у прыватнасці, паэзіі, агульнавядомыя. Лепшыя творы нашых паэтаў становяцца падзеяй не толькі ў рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. І, бадай, не трэба тут падкрэсліваць, што беларуская паэзія карыстаецца шырокай папулярнасцю і любоўю ў шматлікага чытача і слухача.

Аднак прапаганда роднага паэтычнага слова павінна быць больш актыўная і дзейсная. У гэтым сэнсе важнае значэнне набываюць спецыяльныя Дні паэзіі (ці святы паэзіі, — справа, думаецца, не ў назве). Хаця ў Мінску, напрыклад, параўнальна часта праводзяцца літаратурныя вечары і сустрэчы (яны адбываюцца, у прыватнасці, у бібліятэцы «Юнацтва», вну, філармоніі, на фабрыках і заводах), але, на мой погляд, літаратурнае жыццё горада павінна быць больш актыўнае, больш напружанае.

Чаму б нам, па прыкладу Масквы, не наладжваць летам паэтычныя вечары па плошчах і ў парках, чаму б не адкрыць спецыяльнае кафэ «Паэзія» ці хоць бы арганізаваць клубы аматараў паэтычнага слова пры найбольш буйных маладзёжных кафэ? Думаецца, што гэта прывабіла б велізарную колькасць аматараў паэзіі. Зрабіць гэта ў Мінску не дужа цяжка. Мяркуйце самі: колькі ў нашым горадзе літаратурных аб'яднанняў, колькі «неарганізаваных» пачынаючых паэтаў, не кажучы ўжо аб велізарнай прафесіянальнай «гвардыі».

На жаль, нават тое, што зрэдку ў нас робіцца, трэба шчыра сказаць, робіцца далёка не так, як трэба было б. У нас часта не ўдаюцца нават звычайныя сустрэчы паэтаў з чытачамі. Прыкладаў далёка шукаць не трэба.

22 сакавіка ў Палацы культуры трактарнага завода на сустрэчу з чытачамі прыйшла вялікая група беларускіх пісьменнікаў і паэтаў на чале з лаўрэатам літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа, аўтарам кнігі «Колас расказвае пра сябе» Максімам Лужаніным. Але сустрэчы гэтай, па сутнасці, не адбылося, бо... амаль ніхто не прыйшоў. А чаму? Ды таму, што аб сустрэчы ніхто не ведаў: пра яе паведамляла толькі адна невялікая афіша каля самога Палаца культуры.

Прыблізна тое ж самае атрымалася 23 сакавіка ў Доме культуры Мінскага аўтазавода.

Больш падрабязна хочацца спыніцца на першым агульнагарадскім Дні паэзіі, які адбыўся ў Палацы культуры прафсаюзаў 25 лютага. На свята прыйшла вялікая група беларускіх паэтаў. Яны чыталі свае новыя вершы, удзельнікі рэспубліканскіх курсаў па падрыхтоўцы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці праспявалі некалькі песень нашых кампазітараў на словы беларускіх паэтаў. У вечары прынялі ўдзел заслужаныя артысты БССР Міхась Шуманскі і Васіль Юневіч. У фае працаваў кніжны кіёск, дзе прысутныя маглі набыць зборнікі вершаў, атрымаць аўтографы. Вечар, увогуле, пакінуў прыемнае ўражанне, ён, безумоўна, запомніўся кожнаму, хто быў тады ў зале.

На жаль, былі «але». Па-першае, зноў-такі, на вечар прыйшло вельмі мала людзей. Няўжо ў горадзе, дзе дзесяткі інстытутаў і тэхнікумаў, дзе больш пяцідзесяці тысяч студэнтаў і навучэнцаў, дзе ўвогуле шмат моладзі, якая любіць паэзію, аказалася так мала тых, хто шануе роднае паэтычнае слова? Справа, думаецца, у тым, што пра вечар многія проста нічога не ведалі.

Хочацца спадзявацца, што над усім гэтым задумаюцца і таварышы з Бюро прапаганды мастацкай літаратуры пры Саюзе пісьменнікаў БССР, і гаркам камсамола, і культасветустановы нашага горада.

Г. САКАЛОЎ,
студэнт Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута.

Лічыць, што пашанцавала яму ў дзяцінстве ў параўнанні з іншымі — чатыры гады пасылаў яго бацька ў школу; наймалі грамадою настаўніка-дарэктара, стрэшынскага грамацея Філата, ён па хатах і вучыў дзяцей.

Тут не ў першы раз напрошваецца параўнанне з сённяшнім Зломным. Мы размаўляем у настаўніцкай мясцовай васьмігодкі, навокал кнігі, карты, наглядныя дапаможнікі.

Так што, навучыўшыся чытаць і пісаць, лічыўся ўжо Радзівон чалавекам дарослым — працаваць пара. Уладкаваўся на работу да князя Друцкага-Сакалінскага.

А тут якраз і сталыпінская рэформа. Раскалолася Зломнае на хутары — выбіралі людзі на балотах сухадольчыкі і на сабе перацягвалі хаты. Іншы раз два—тры месяцы мянялі. Сям'і Архіпавіча пашанцавала — з першага разу ўдала пасяліліся.

«Абрыдла братам працаваць на чужое здароўе. Вырашылі яны пайсці па Расіі праўды шукаць...»

Пакідалі людзі Зломнае, у гарадах працавалі, нават у Пецярбургу, але нікому вышэй за дворніка ўзняцца не давялося. А калі часам наязджалі яны на радзіму, нявесела расказвалі, што нідзе праўды няма.

У 1912 годзе і Архіпавіч трапіў упершыню ў вялікі горад, у Пецярбург — не па сваёй волі, праўда, па царскай — у салдаты забралі.

Тут і сустрэў ён рэвалюцыю. Вывелі іх роту да Абводнага канала, насустрач людзі з чырвонымі сцягамі ідуць і песні спяваюць — ведаў ужо Архіпавіч, што азначаюць гэтыя сцягі і якія «Вихри враждебные веют над нами...» І калі афіцэр скамандаваў страляць, ён кінуў вінтоўку і пабег насустрач сцягам і песні.

У казарму ён ў той дзень не вярнуўся — пабываў на Дварцовай плошчы, ля Смольнага, на вакзалах — на шапцы ўжо чырвоная стужка. Начаваў у земляка-дворніка, а раніцою сустрэў у горадзе сваіх сяброў-салдат, і разам пайшлі яны ў Смольны. Там прызначылі яго камандзірам узвода і накіравалі ахоўваць Анічкаў мост. А ў вольны час хадзіў ён на мітынгі і слухаў ленінскую праўду, якую гаварылі бальшавікі. Самога Леніна, праўда, яму пачуць не давялося.

— Вельмі шкада, вядома, — гаворыць, — але хваліцца не буду.

А лістоўкі, пракламацыі, газеты чытаў уголас знаёмым і незнаёмым. І першыя Дэкрэты Савецкай улады вывучыў напамяць, і потым, калі вярнуўся ў Зломнае ў васемнаццатым годзе, расказваў пра іх суседзям.

«І ўзяла верх у кастрычніку Ленінская праўда»...

— Толькі вы не думайце, што адразу ўсё добра стала, — папярэджвае Архіпавіч.

І хутары засталіся пакуль, і балоты, і дастатак не адразу прыйшоў. Адгуляў вяселле — што за вяселле? Квас пілі на тым вяселлі, але весела было.

— Затое жаніх паглядны быў, — смяецца Архіпавіч, — боты меў салдацкія. Рэдкасць у сяле.

Мне ў Радзівоне Архіпавічы больш такая рыса запомнілася: не скардзіцца ён на былыя цяжкасці, а ўсё падводзіць да таго, што, маўляў, каб не папрацавалі людзі, не пастаялі за Ленінскую праўду ў рэвалюцыю і пасля яе—не было б сённяшняга такога добрага жыцця.

— І цяпер, — тут жа агаворваецца Архіпавіч, — клопату хапае, толькі клопат гэты зусім іншы, вось я, напрыклад, — да гэтага часу радыёпрыёмніка не купіў... Або ў старшыні нашага клопат—дзе знайсці кіраўніка духавога аркестра.

Але клопат сённяшняга старшыні калгаса «Светлы шлях» Івана Сямёнавіча Хадаска, хоць не вычэрпваецца адным духавым аркестрам, вядома, але намнога радаснейшы, чым справы першага старшыні калгаса ў Зломным — ён быў арганізаваны ў 1929 годзе і называўся «12 год Кастрычніка». Жылі тады яшчэ па хутарах, і хадзіў па дамах і агітаваў за калгас старшыня Іван Сіроткін — яго добра памятае Архіпавіч. Зломенцаў доўга ўгаворваць не трэба было — спачатку аб'ядналіся чатыры гаспадаркі, потым да іх далучыліся яшчэ і яшчэ. Прывёў свайго каня ў калгас і Радзівон Міхальцоў.

«...Рабочы і селянін самі сталі гаспадарамі сваіх фабрык, сваёй зямлі і свайго жыцця», — так заканчваецца казка.

Казка добра скончылася на самым цяжкім і цікавым месцы, на тое яна і казка. Дарэчы, казачнік нічога больш і сказаць не мог, бо запісана «Ленінская праўда» збіральнікамі фальклору хутка пасля арганізацыі калгаса ў Зломным.

А жыццё працягвалася. Сяляне вучыліся калектыўна гаспадарыць на зямлі — навука нялёгкая, вопыту ніякага, уся «тэхніка» мясцілася ў невялікім хляве — некалькі коней, плугоў і бароны.

Сталі зломенцы перасяляцца з хутароў у адно месца. Цяпер ужо не кожны асобна свой дом на сабе перавозіў, а ўсе разам памагалі адзін аднаму — на тое і калгас.

А потым надоўга пасяліліся ў Зломным вясёлыя хлопцы — меліяратары.

Калі б цяпер прыехалі сюды збіральнікі фальклору — сваімі вачыма ўбачылі б працяг казкі. Мне расказаў Архіпавіч так:

— Ленінская праўда спіны разагнула, але рукам і галаве спакою не дала, бо толькі тады праўда моцная, калі на сумленнай працы трымаецца.

Доўга маўчыць стары, а потым усміхаецца і гаворыць:

— Раней, да рэвалюцыі, з нашага брата вышэй за дворніка ніхто не падняўся. А ў мяне вось дачка — урач, а сын — афіцэр-лётчык.

Ён дастае з кішэні пенсійную кніжку.

— І ў жонкі такая ж. Калгас плаціць...

...Старыя гавораць, што Зломнаму больш за сто гадоў. Іван Сямёнавіч Хадасок гісторыю вёскі ведае, але гаворыць ён пра цяперашняе і яшчэ больш пра будучае. У райкоме партыі сказалі — «Светлы шлях» гаспадарка сярэдняя. У Зломным гэта пацвердзілі. Мы мала гаварылі пра вытворчыя справы, хоць я запомніў, што калгас па надою малака першынствуе ў раёне і свае пазіцыі ўступаць не збіраецца; вось што радуе старшыню больш за ўсё: цяпер са Зломнага людзі нікуды не выязджаюць, а тыя, што паехалі раней, вяртаюцца назад.

...На вёску апускаюцца прыцемкі. Мы заходзім у калгасны клуб. Тут ідзе рэпетыцыя хору.

— ...Вы тут цікавіліся, я чула, колькі гадоў Зломнаму? — пытаецца ў мяне пажылая калгасніца. — Гавораць, больш за сто. — Але калі дакладна — дык сорак дзевяць... Столькі, колькі і Савецкай уладзе...

Баяніст у гэты момант расцягнуў мяхі, і ў звонкіх частушках зазвінеў голас маёй субяседніцы. Архіпавіч усміхнуўся:

— Правільна называецца калгас у Зломным — «Светлы шлях»...

Д. РАДЗІНСКІ.

Жлобін—Гомель.

РЭДКІ МЕДАЛЬ



У Гомельскім абласным краязнаўчым музеі пад № 4709 беражліва захоўваецца дарагі экспанат. Гэта медаль з партрэтным адбіткам Уладзіміра Ільіча Леніна. На адваротным баку—словы «Няхай жыве свабода вялікага працоўнага народа». І дата: «25 кастрычніка 1917 г.». Памер яго—2,5 сантыметра ў дыяметры. Медаль бронзавы, пацямнеў ад часу, але на ім засталіся сляды нікеліроўкі.

Як нам стала вядома, медаль быў выпушчаны Манетным дваром у Петраградзе ў гонар першай гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Ім узнагароджвалі актыўных удзельнікаў Кастрычніка, байцоў і камандзіраў нядаўна створанай Чырвонай Арміі, якія вызначыліся ў барацьбе з унутранай і замежнай контррэвалюцыяй. Цяпер такіх медалёў па ўсёй краіне налічваецца не больш дзесяці.

М. ГАТОЎКІН,
галоўны хавальнік фондаў музея.

„ГОЛАС ЛЕНІНА"

На экраны выйшаў новы кінанарыс «Голас Леніна», выпушчаны студыяй «Маснавучфільм». Пра тое, як стваралася гэта карціна, па просьбе АДН расказвае рэжысёр і адзін з аўтараў сцэнарыя М. Д. Таварноў.

Пярвічныя запісы прамоў Уладзіміра Ільіча Леніна... Нягледзячы на значныя ў гэтых запісах перашкоды — шумы, шчоўканні і неразборлівасць некаторых слоў, усё ж даносіўся да нас голас правадыра рэвалюцыі, як жывы вецер незабыўных дваццатых гадоў.

Тады яшчэ не было адчувальных мікрафонаў і радыёэлектроннай апаратуры, здольнай рэгістраваць шырокую паласу гукавых частот. Стары, зношаны апарат, які ўжываўся для запісу прамоў Ул. І. Леніна, недасканалая тэхналогія працэсу запісу і вырабу грампласцінак не забяспечвалі іх добрай якасці.

Захавалася унікальная фатаграфія — Ленін перад кардонным рупарам гуказапісваючага апарата. Яна дастаткова ярка ілюстравала недасканаласць тэхнікі таго часу. Але і гэта тэхніка, выкарыстаная па ініцыятыве Ільіча, з гонарам апраўдвала сваё дзейснае агітацыйнае прызначэнне ў тыя цяжкія для маладой Савецкай рэспублікі гады — гады голаду, разрухі, грамадзянскай вайны. Пласцінкі, якіх было ў дастатковай колькасці, вялікімі тыражамі разыходзіліся па краіне.

Калі ў Інстытуце марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС нас са сцэнарыстам Юрыем Махмудбекам пазнаёмілі з гісторыяй аднаўлення старых запісаў прамоў Уладзіміра Ільіча, гэта тэма адразу ж захапіла. Да таго ж яна давала магчымасць прадоўжыць нашы творчыя пошукі ў навукова-папулярнай кінематаграфіі, пачатыя ў папярэдніх фільмах, такіх, як «Ленін гаворыць з Амерыкай» і «Незабыўныя старонкі гісторыі».

Такім чынам, пры ўсебаковай і шчырай дапамозе загадчыка секцыі кінафотадакументаў Цэнтральнага партыйнага архіву Андрэя Пятрова, доктара тэхнічных навук прафесара Ісака Горана і інжынера Давіда Гакліна мы пачалі нашу работу над сцэнарыем, а затым і фільмам.

Калі знаёмішся са шматлікімі і разнастайнымі матэрыяламі, разгортваецца карціна велізарнай, стараннай работы вучоных і многіх спецыялістаў на працягу больш чвэрткі стагоддзя, іх настойлівы пошук вырашэння тэхнічных праблем, звязаных з аднаўленнем недасканалых і да таго ж прыйшоўшых у непрыгоднасць матрыц, з якіх друкаваліся грампласцінкі з прамовамі Ільіча.

Мы павінны былі адабраць галоўнае, істотнае для караткаметражнага фільма, і гэта, бадай, было самай цяжкай справай.

У першую чаргу быў адабраны фрагмент з прамовы Уладзіміра Ільіча, сказанай 16 кастрычніка 1919 года з балкона Массавета да чырвонаармейцаў, якія ішлі на фронт для барацьбы з інтэрвентамі і белагвардзейцамі.

На прыкладзе гэтага фрагмента і было вырашана паказаць паступовыя вынікі ў аднаўленні старых запісаў.

Вучоным удалося з дапамогай савецкай электроннай тэхнікі ажыццявіць карэкціроўку пярвічных запісаў, ліквідаваць усялякія перашкоды ў паўзах паміж словамі і наблізіць голас да натуральнага гучання.

Паўставала пытанне: як жа нам, не перагружаючы фільм шматлікімі дэталямі гэтай вялікай і складанай тэхнічнай праблемы, коратка і даходліва расказаць пра ўсё гэта з экрана?

З апаратарамі Іванам Канаевым і Святаславам Валовым мы выкарысталі магчымасці камбінаваных і мультыплікацыйных здымак.

Пры ўдзеле спецыялістаў, якія працавалі над аднаўленнем запісаў прамоў Ул. І. Леніна, мы дакументальна, крок за крокам аднавілі на экране асноўныя этапы іх творчых і тэхнічных пошукаў.

Вялікую дапамогу аказалі нам саратнікі Леніна — старыя бальшавікі Фёдар Пятроў і Сяргей Уралаў. Яны ўдзельнічалі ў здымках.

Мы паказваем у стужцы «Голас Ільіча» вялікую і нялёгкую працу савецкіх спецыялістаў, якія падаравалі мільёнам людзей магчымасць чуць жывое слова правадыра. У фінале фільма гучыць яго натхнёны голас... Ленін тлумачыць сутнасць Савецкай улады.

Міхаіл ТАВАРНОЎ,
рэжысёр кінастудыі «Маснавучфільм».
(АДН).

ВЫПІСВАЙЦЕ І ЧЫТАЙЦЕ ГАЗЕТУ «КНИЖНОЕ ОБОЗРЕНИЕ»

З 5 мая 1966 года будзе выходзіць штотыднёвая газета «Книжное обозрение» — орган Камітэта па друку пры Савеце Міністраў СССР. Газета будзе прапагандаваць айчынную і замежную прагрэсіўную літаратуру, аператыўна інфармаваць аб кнігах, што выйшлі за тыдзень і рыхтуюцца да выпуску ў цэнтральных і мясцовых выдавецтвах.

Чытач знойдзе ў газеце рэцэнзіі на асобныя кнігі, агляды літаратуры, урыўкі і ілюстрацыі з твораў, якія рыхтуюцца да выпуску, вершы, расказы аб планах пісьменнікаў, паэтаў, вучоных, літаратурныя партрэты аўтараў кніг, рэпартажы з выдавецтваў і паліграфічных прадпрыемстваў, дзе нараджаюцца кнігі, практычныя парады па камплектаванню хатніх бібліятэк і рабоце з кнігай, матэрыялы аб вопыце прапаганды літаратуры кніжнымі магазінамі, бібліятэкамі, грамадскімі распаўсюджвальнікамі і іншыя матэрыялы.

«Книжное обозрение» разлічана на шырокага чытача: рабочых, калгаснікаў, служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, вучоных, выкладчыкаў, студэнтаў, вучняў, бібліятэчных, выдавецкіх і кнігагандлёвых работнікаў, грамадскіх прапагандыстаў літаратуры—усіх, хто любіць кнігу і працуе з ёю.

Газета будзе выходзіць на 12 старонках палавіннага фармату «Праўды».

Падпіска на «Книжное обозрение» прымаецца на другое паўгоддзе 1966 года аддзяленнямі сувязі, грамадскімі распаўсюджвальнікамі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях.

З выхадам газеты спыняецца выпуск часопіса «Новые книги».

ЧАСОПІС «РТ»

Савецкія чытачы атрымаюць у бліжэйшыя дні першы нумар новага штотыднёвага часопіса «РТ». Яго назву ўтвараюць пачатковыя літары слоў «радыё» і «тэлебачанне».

Часопіс «РТ» будзе выдавацца Камітэтам па радыёвяшчанню і тэлебачанню пры Савеце Міністраў СССР. Як вядома, радыё і тэлебачанне шырока распаўсюджаны ў нашай краіне. А папулярнага масавага выдання, прысвечанага «праблемам эфіру», да гэтага часу не было. Такім і павінен стаць «РТ» — ілюстраваны грамадска-палітычны штотыднёвік.

Часопіс будзе публікаваць радыё- і тэлепраграмы, даваць інфармацыю пра найбольш цікавыя перадачы і іх крытычны аналіз. Будуць таксама змяшчацца пісьмы і рэкамендацыі радыёслухачоў і тэлегледачоў, якія памагаюць удасканаленню форм і жанраў радыё- і тэлеперадач. У цэнтры ўвагі часопіса пастаянна будуць знаходзіцца праблемы ўздзеяння радыё і тэлебачання на самыя розныя бакі грамадскага жыцця як у нашай краіне, так і за рубяжом, пытанні эканомікі, культуры, мастацтва.

Аб'ём часопіса — 16 старонак. Шмат месца маецца на ўвазе адводзіць каляровым і чорна-белым рэпрадукцыям і фатаграфіям.

Першы нумар часопіса выходзіць 22 красавіка. Вядучае месца ў ім займаюць матэрыялы, прысвечаныя дню нараджэння Ул. І. Леніна. Публікуецца нататка А. Золатава «Думкі на выстаўцы».

Напэўна, выкліча цікавасць чытачоў дыскусія на тэму «Тэлебачанне і грамадства».

Часопіс публікуе каляровы разварот аб будаўніцтве тэлегорада ў Астанкіне, матэрыял аб перспектывах «Інтэрбачання».

НА ЭКРАНЕ — ПРАВАДЫР

У сувязі з 96-годдзем з дня нараджэння Ул. І. Леніна ў рэспубліцы шырока паказваюцца кінафільмы пра жыццё і дзейнасць вялікага правадыра. Гледачам прапанаваны мастацкія кінакарціны «Ленін у Кастрычніку», «Ленін у 1918 годзе», «Апасіяната», «У пачатку стагоддзя», «Імем рэвалюцыі», «Сіні сшытак», «Па пуцёўцы Леніна», «Сям'я Ульянавых», «Расказы аб Леніне» і інш.

На экраны выпускаецца таксама новая шырокаэкранная мастацкая кінааповесць «Ленін у Польшчы» сумеснай вытворчасці кінастудыі «Масфільм» і польскага кінааб'яднання «Студыя». Аўтары сцэнарыя — Я. Габрыловіч і С. Юткевіч, рэжысёр-пастаноўшчык — С. Юткевіч. Карціна расказвае пра Ул. І. Леніна ў эміграцыі ў гады, якія папярэднічалі першай сусветнай вайне. У той час Ленін разам з Н. К. Крупскай і яе маці жыў у Кракаве і Пароніне. Сюды з Расіі, з якою правадыр падтрымліваў цесную сувязь, прыязджалі яго верныя сябры і саратнікі — Пятроўскі, Шагаў, Бадаеў, Самойлаў, Муранаў...

Пачынаецца вайна 1914 года. Уладзіміра Ільіча па бязглуздай падазронасці ў шпіянажы на карысць рускага імператара арыштоўваюць і садзяць у аўстрыйскую турму. Знаходзячыся ў зняволенні, Уладзімір Ільіч успамінае пра свае сустрэчы і гутаркі з польскімі таварышамі, пра цяжкае эміграцыйнае жыццё.

У ролі Ул. І. Леніна здымаўся народны артыст СССР М. Штраух. У астатніх ролях заняты А. Лісянская (Н. К. Крупская), А. Паўлычава (маці Крупскай), Э. Фецінг (Ганецкі), І. Кусмерская (Улька), К. Кальчынскі (Анджэй) і іншыя.

Гледачы таксама пазнаёмяцца з новай кінастужкай «Уладзімір Ульянаў», створанай рэжысёрам Б. Валковічам на Ленінградскай студыі навукова - папулярных фільмаў па сцэнарыі Льва Горына. Гэта яркае, хвалюючае кінаапавяданне пра сімбірскі, казанскі і самарскі перыяды жыцця маладога Леніна, пра тое, як ён стаў на шлях рэвалюцыйнай барацьбы.

Шмат цікавага пра вялікага правадыра партыі і савецкага народа раскажуць хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя кінафільмы: «Жывейшы за ўсіх жывых», «Ільіч у Лондане», «Ленін з намі», «У далёкім Шушанскім», «Кінадакументы пра Ул. І. Леніна», «Жывы Ленін», «Ленінскі Першамай», «Помнікі трох рэвалюцый», «На радзіме Ул. І. Леніна», «Пецярбургскія гады», «Ленін гаворыць з Амерыкай».

З нашай пошты

СЛОВЫ І СПРАВЫ

Некалькі дзён таму назад работнікі кінатэатра «Навіны дня» (былы «Дзіцячы») прапанавалі гледачам анкету, у якой прасілі іх выказваць заўвагі, пыталі, якія фільмы мінулых гадоў хацелі б яны паглядзець.

Не анкета — узор ветлівасці.

Па прастаце душэўнай я падумала, што кінамеханікі не заўважаюць, як псуецца настрой гледачоў, калі рвецца стужка, што касір лічыць сваім абавязкам груба сказаць: «На які рад білеты дам, на такім і будзеце сядзець», хоць і просіш білеты на больш далёкі ці блізкі рад (ёсць жа на свеце блізарукія і дальназоркія людзі).

Запоўніла я анкету і пачала шукаць тую скрынку, у якую можна было б апусціць мае заўвагі і прапановы. Кантралёр паглядзела са здзіўленнем:

— Хіба можна прымаць гэта ўсур'ёз?

Спрабавала даведацца аб прызначэнні гэтай анкеты — адміністрацыя сама не ведала, дзеля чаго надрукавалі яе масавым тыражом.

Але не ў анкеце справа.

Мінчане даўно дамагаліся адкрыцця ў горадзе кінатэатра, дзе б дэманстраваліся дакументальныя фільмы — такі кінатэатр ёсць. Цяпер, напэўна, давядзецца прасіць, каб гэты кінатэатр закрылі, а дакументальныя фільмы глядзець на падоўжаных сеансах у «Міры», «Зорцы» ці сядзець вечарам перад тэлевізарам і чакаць пачатку перадачы «Клуб кінападарожнікаў» (калі на тэлестудыі непаладкі — там не чакаюць нашых заўваг і прапаноў, а проста на экране з'яўляецца дыктар і вельмі ветліва просіць прабачэння ў гледачоў).

У «Навінах дня» на людзей не асабліва звяртаюць увагу, ім любяць прапаноўваць «сюрпрызы», асабліва па пятніцах, калі працуе кінауніверсітэт «Веды»: плёнкі старыя, рвуцца, але глядач церпіць, бо не мае магчымасці пазнаёміцца з Х. Бідструпам асабіста ці з'ездзіць у Дрэздэн паглядзець шэдэўры жывапісу.

Але пятніца 15 красавіка, калі дэманстраваўся фільм «Галіна Уланава», пераўзышла ўсе чаканні.

Адказныя за паказ асобы вырашылі, што нам неабавязкова глядзець фільм поўнасцю, таму з лёгкасцю незвычайнай выкінулі ўрывак з «Жызэлі» Адана (напэўна, спадзяваліся, што гэты твор гледачы могуць паглядзець у Беларускім тэатры оперы і балета), выкінулі ўрывак, у якім вялікая балерына расказвае аб працы над «Рамео і Джульетай» С. Пракоф'ева.

Кінамеханікам здалося, што калі фільм будзе дэманстравацца ў звычайным парадку, то гледачам будзе нецікава.

Што ж атрымалася?..

Недзе ў пачатку глядзім адажыо з II акта «Лебядзінага возера». Не скончыўшы адажыо, Уланава пачала танцаваць у «Шапеніяне». Потым паказваюць урыўкі з «Рамео і Джульеты». З грэхам папалам даходзяць да месца, дзе Рамео гіне... І раптам цуд: недзе знайшлі канец адажыо з «Лебядзінага возера» і далі даглядзець гэты ўрывак. Усё ідзе як след... «Чырвоны мак» Гліэра, урыўкі з «Жызэлі». Голас дыктара становіцца пяшчотным-пяшчотным:

«— Нет повести печальнее на свете, чем повесть о Ромео и Джульетте», — адшукалі апошнія кадры з «Рамео і Джульеты», у якіх Уланава—Джульета, убачыўшы, што Рамео забіў сябе, бярэ кінжал і канчае жыццё самагубствам.

Але самае цяжкае выпрабаванне на долю гледачоў засталося, калі Уланава пачала танцаваць «Паміраючага лебедзя» Сен-Санса, а ў зале ўспыхнула святло. Людзі гадалі, чым яшчэ парадуюць іх кінамеханікі, якія, пэўна, вырашылі скончыць сеанс датэрмінова.

Пасля сеанса заходжу да адміністратара, а там стаяць людзі, абураюцца, пытаюць, як называць такія фокусы.

— А ў адміністратара скончыўся рабочы дзень, прыходзьце заўтра, — сказала касірша і бесцырымонна выправадзіла ўсіх за дзверы.

Шкада, што гледачы днём працуюць і сустрэцца з начальствам «Навіны дня» не маюць магчымасці.

Хацелася б пачуць, які адказ дасць адміністрацыя «Навін дня» на гэтае пісьмо.

В. ПШЫРКОВА.

Пяць гадоў В. Рагойша і Л. Акаловіч на грамадскіх пачатках распаўсюджваюць кнігі. Актывісты падтрымліваюць цесную сувязь з мінскім кніжным магазінам № 6, аблкнігагандлем. У магазіне яны заўсёды жаданыя госці, ім ахвотна памагаюць, раяць, дзе што знайсці.

Летась аспіранты распаўсюдзілі літаратуры на 3750 руб. Гэта пераважна кнігі рэспубліканскіх выдавецтваў мінулых гадоў выдання.

25 красавіка адбудзецца Усесаюзная нарада лепшых грамадскіх прапагандыстаў і распаўсюджвальнікаў літаратуры. На гэтую нараду запрошаны і кнігалюбы В. Рагойша і Л. Акаловіч.

На здымку: лепшыя грамадскія распаўсюджвальнікі кнігі В. Рагойша і Л. Акаловіч у магазіне № 6 рыхтуюцца да чарговай сустрэчы з пакупнікамі.

В. СУДНІКОВІЧ,
старшы інспектар Белкнігагандлю.

«АЛЕКА» НА СТУДЭНЦКАЙ СЦЭНЕ

Студэнты - вакалісты кансерваторый павінны атрымліваць усебаковую прафесіянальную падрыхтоўку ў класах спецыяльных спеваў. У той жа час жыццё падказала неабходнасць стварэння оперных студый, дзе будучыя салісты тэатра набываюць творчую практыку. Ёсць такая студыя і пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Днямі яна пазнаёміла грамадскасць Мінска са спектаклем «Алека» па аднайменнай оперы С. Рахманінава.

Скажам адразу: гэты спектакль не стаў цікавай з'явай, якая ўзбагачае ўяўленне студэнтаў-выканаўцаў аб цудоўных магчымасцях试 опернага мастацтва, аб непасрэдным абавязку опернага спевака, раскрываючы вобраз свайго героя, выказаць уласныя адносіны да яго.

Справа тут не ў тым, што ў спектаклі былі «недапетыя» ноты і занадта гучна грымеў часам аркестр, заглушаючы спевакоў, і ў асобных эпізодах паспешлівыя тэмпы перашкаджалі адчуць прыгажосць музыкі, (напрыклад, аркестравае інтэрмецца паміж першай і другой карцінамі, або жаночы танец). Насцярожвае іншае: мы сустрэліся са штампам, з адсутнасцю спробы неяк інакш, па-новаму «прачытаць» партытуру твора, усхвалявацца яго зместам, каб дарэчы было нагадаць словы Чарнышэўскага пра тое, што творы мастацтва не толькі апавядаюць пра жыццё, але і выносяць яму прысуд.

Нам могуць запярэчыць: маўляў, такія патрабаванні неправамерныя, у спектаклі ўдзельнічалі не высокакваліфікаваныя оперныя артысты, а студэнты, якім нестае выканаўчага майстэрства, вопыту. Да гэтага могуць дадаць, што студыя мае права на традыцыйнасць вырашэння — гэтак лягчэй замацаваць з пачынаючымі выканаўцамі адпаведныя оперныя... ледзь не паўтарыў слова «штампы», але трэба сказаць — «заканамернасці», якія выпрацаваліся сцэнічнай практыкай. Могуць прывесці і іншыя пярэчанні. Але ж ад гэтых слоў не павысіцца вартасць спектакля. Яго ўдзельнікі — пастаноўшчыкі і выканаўцы — не стануць бліжэй да патрабаванняў, якія ставяцца опернаму тэатру сёння. Бо за ўсімі гэтымі меркаваннямі хаваецца, урэшце, абыякавасць, якая не здольна ствараць сапраўднае мастацтва. Творчае жыццё, перажыванні падменены ў спектаклі паказам, выяўленнем знешняй формы падзей,

Сапраўды, усё ў гэтым спектаклі знешняе. Таму пачуцці, думкі, якія ёсць у музыцы і словах, не ўзбагачаюцца сцэнічнымі паводзінамі выканаўцаў. Вось чаму такія невыразныя ў спектаклі нюансы, адценні дынамікі непасрэдна ў самім спяванні. Таму няма непасрэдных сцэнічных зносін паміж удзельнікамі падзей оперы: яны дзейнічаюць толькі па ўказцы дырыжора (Л. Лях), без творчага парывання. Таму, пры агульнай паспешлівасці і мітусні на сцэне, псіхалагічны падтэкст учынкаў герояў замаруджаны.

Даволі нагадаць эпізоды, дзе Алека (студэнт Ю. Ганчароў, клас педагога М. Людвіг) слухае трагічнае апавяданне старога цыгана (студэнт Д. Марозаў, клас педагога М. Сярдобава) пра ўласныя нягоды жыцця, або дзе малады цыган (студэнт А. Калеснічэнка, клас педагога М. Зюванава) таворыць Земфіры (студэнтка В. Садоўская, той жа клас) пра свае пачуцці. У абодвух выпадках усе выканаўцы абыякавыя — і вакальна, і сцэнічна.

У чым, на нашу думку, карэнні хібаў студыйнага спектакля «Алека?» На вучэбную сцэну, дзе ўсе павінны быць у няспынным пошуку — і выкладчыкі, і студэнты (бо ёсць час, няма касавага плана, неабходнасці даваць прыбытак), аказалася механічна перанесеным безаблічнае рамесніцкае відовішча, якое так часта яшчэ, на жаль, сустракаецца ў прафесіянальных тэатрах. Гэтая акалічнасць выклікае асаблівае здзіўленне не толькі таму, што сёння так рабіць нельга, але і таму, што рэжысёр спектакля М. Сярдобаў (ён жа і выкладчык сольных спеваў у кансерваторыі), педагог М. Зюванаў — у нядаўнім мінулым выдатныя оперныя спевакі, з высокім мастацкім густам і сцэнічнай культурай. Дык няўжо яны не бачаць, што робяць іх выхаванцы на студыйнай сцэне?

Пры ўсім гэтым спектакль пасведчыў, што ўсе выканаўцы па вакальных дадзеных маюць перспектыву спяваць у оперным тэатры. Прыемна адзначыць, што колькасна невялічкі жаночы хор (хормайстар С. Лях) гучыць досыць чыста, мякка і спявае з тонкай нюансіроўкай. Прывабная мізансцэна, калі змешаны хор удала выконвае песню «Адзін месяц». Прыгожа гучыць голас у В. Садоўскай, калі яна спявае песню «Стары муж». Трэба адзначыць і ўдалую работу балетмайстра З. Раманоўскай, сціплае мастацкае афармленне І. Крэйдзіна.

І. НІСНЕВІЧ.

ВЕЧАР САНАТЫ

Цікавы канцэрт адбыўся 19 красавіка ў зале Мінскай кансерваторыі. Санаты Бетховена і Брамса выканаў прафесар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Уладзіслаў Эпштэйн. З цыкла трыццаці дзвюх санат Бетховена саліст выканаў дзве перадапошнія.

Празрыста, светла гучаць першыя такты Трыццатай санаты (у пачатку канцэрта). Прыкметная няўстойлівасць у рытміцы і акцэнціроўцы другой і апошняй частак санаты стварае ілюзію імправізацыі.

Саліст заканчвае першае аддзяленне канцэрта выкананнем санаты ля-бемоль-мажор. Поўная жывога, творчага духу яе трактоўка. Найбольш ярка, маляўніча прагучала другая частка санаты. Гукі нястрымнай народнай весялосці, бясконцай радасці напаўняюць залу. Жыццесцвярджальна і пераканаўча прагучаў фінал.

У другім аддзяленні вечара цудоўна былі выкананы творы кампазітара Брамса.

З. НАСЦЕНКА.

ЗАГАДЧЫК КЛУБА ПІША ПЕСНІ

Паўгода назад у пасёлак торфапрадпрыемства «Усвіж-Бук» прыехаў малады хлопец. Праз некалькі дзён рабочыя даведаліся, што ён будзе працаваць у клубе.

Папярэднія загадчыкі занядбалі работу, і многія сумняваліся, ці ўдасца і гэтаму навесці парадак. Але новы загадчык Уладзімір Кудраўцаў як мае быць узяўся за справу. Арганізаваў гурток мастацкай самадзейнасці. І на яркі агеньчык у вокнах клуба ахвотна пайшлі рабочыя і служачыя, моладзь з бліжэйшых вёсак.

Нядаўна ў раённым Доме культуры адбыўся заключны канцэрт агляду мастацкай самадзейнасці школ. Канцэрт пачаўся выступленнем хору Усвіжбукскай сярэдняй школы. Кожны нумар вакалістаў гледачы сустракалі з цікавасцю. Асабліва спадабаліся ім «Песня аб Талачыне» і «Усвіжбукскі вальс». Словы і музыку гэтых песень напісаў Уладзімір Кудраўцаў.

І. БРАЛКО.

Талачынскі раён.

АЎТАР НЕЎМІРУЧАГА «ДОН-КІХОТА»

ДА 350-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ МІГЕЛЯ СЕРВАНТЭСА

Калі меркаваць па апісаннях яго сучаснікаў, Сервантэс знешне быў падобны на свайго «рыцара сумнага вобліку»: вельмі высокі, худы, з прадаўгаватым тварам, высокім ілбом і бародкай клінам. Жыццё ж вялікага пісьменніка магло б стаць сюжэтам прыгодніцкага рамана.

Вось, коратка, яго біяграфія. Сын малазабяспечанага «лекара-хірурга», ён не змог атрымаць сістэматычнай адукацыі, але затое прайшоў удоўж і ўпоперак усю Іспанію і здолеў пабачыць жыццё самых розных пластоў іспанскага народа. У 1568 годзе, калі яму споўнілася 21 год, Сервантэс паступіў на службу да кардынала Юліюса Аквавіва, які бярэ яго з сабою ў Італію. Там Сервантэс шмат чытае па-італьянску і вывучыць кардынала іспанскай мове. А ўжо ў канцы 1570 года адзначаецца храбрасць салдата Мігеля Сервантэса. 7 кастрычніка 1571 года ў бай пад Лепанта ён двойчы паранены: у грудзі і ў руку. Але Сервантэс не пакідае службы і ў 1575 годзе едзе ў Мадрыд, каб атрымаць званне капітана, едзе з рэкамендацыйнымі пісьмамі брата самога караля, галоўнакамандуючага іспанскімі войскамі ў Італіі, і іспанскага віцэ-караля Сіцыліі. Але карабель, на якім ён плыў разам з братам Радрыга, быў захоплены туніскімі флібусцьерамі. Знайшоўшы рэкамендацыйныя пісьмы высокапастаўленых асоб, флібусцьеры рашылі, што Сервантэс таксама важная асоба, і запатрабавалі за яго велізарны выкуп. Сям'я будучага пісьменніка не магла заплаціць такой сумы. Чатыры разы Сервантэс спрабаваў уцякаць і кожны раз яго схаплівалі зноў. Пасля чацвёртых уцёкаў яго прадалі ў рабства. Урэшце-рэшт яго выкупляюць, і 24 кастрычніка 1580 года ён едзе ў Іспанію. На радзіме Сервантэс займае розныя пасады, але ніводная з іх не можа пракарміць яго. У армію яго не бяруць, рэкамендацыйных пісьмаў няма. Каб як-небудзь звесці канцы з канцамі, Сервантэс піша камедыі і сцэнкі з жыцця простага народа і прадае іх (на гэтых творах стаяла імя таго, хто плаціў). 12 снежня 1584 года Сервантэс жэніцца. Пасагу жонкі ледзь хапіла на тое, каб заплаціць асноўныя даўгі. Розныя непаладкі на рабоце прыводзяць яго ў суд, яго прыгаворваюць да аплаты велізарнай сумы. Яго адлучаюць ад царквы і, нарэшце, кідаюць у турму. Пасля выхаду з турмы жыццё яго па-ранейшаму вельмі цяжкое. Як расказваюць сучаснікі, ён «вымушаны быў браць у доўг тканіну для свайго адзення». Іншыя паэты стараліся памагчы яму, але беспаспяхова. Нават вялікі Лопэ дэ Вэга не змог выклапатаць для яго месца ў Мадрыдзе. Жыццё Сервантэса было настолькі цяжкое, што і да гэтага часу ў народзе бытуюць прымаўкі: «галодны, як Сервантэс», «няшчасны, як Сервантэс». 23 красавіка 1616 года ён памёр, пакінуўшы свету шмат бліскучых твораў, а дзецям і жонцы — неаплочаныя даўгі...

Вялікі пісьменнік пісаў у розных жанрах. З-пад яго пяра выйшлі камедыі і трагедыі, камічныя і сатырычныя п'есы, буколічныя і плутаўскія раманы, дыдактычныя навелы і г. д. Аднак сапраўдную бессмяротнасць прынёс яму раман «Дон-Кіхот». Сёння для многіх Сервантэс — толькі аўтар «Дон-Кіхота». У чым жа справа, чаму гэты твор набыў такую вядомасць і зрабіў бессмяротным яго аўтара?

Буржуазныя крытыкі хочуць бачыць у гэтым творы толькі пратэст супраць рыцарскіх раманаў. Аднак калі б гэта было сапраўды так, то Сервантэсу дастаткова было б напісаць толькі першыя раздзелы: ад чытання рыцарскіх раманаў Дон-Кіхот вар'яцее. Сервантэс на гэтым не спыняецца. Ён прымушае свяшчэнніка прагледзець усе кнігі, якія чытае Дон-Кіхот, і знішчае «не толькі шкодныя, але і многа добрых і карысных кніг». Інквізіцыя не магла не бачыць у гэтым рэзкай крытыкі царкоўнай цэнзуры. Вар'яцтва Дон-Кіхота, яго захапленне рыцарствам дае магчымасць Сервантэсу высмейваць усю хлусню, несумленнасць, глупства грандаў і арыстакратаў. Дон-Кіхот — гэта вельмі добры, сумленны, смелы і энергічны чалавек, ён поўны самых лепшых намераў, але ён страціў здольнасць адрозніваць сапраўднае ад выдуманага. Многія члены савета інквізіцыі бачылі ў гэтым творы кашчунства і намёк на каталіцкую веру і яе дагматы. Буйныя феадалы таксама былі пакрыўджаны: самыя лепшыя сярод тытулаваных асоб, што сустракаюцца з Дон-Кіхотам на старонках кнігі, не разумеюць станоўчых якасцей героя. Як нізка выглядаюць яны ў параўнанні з Дон-Кіхотам! Дон-Кіхот называе царкоўнікаў «чорнымі ліхадзеямі, якія гатовы на ўсялякія подласці». Праўда, перад смерцю ён становіцца добрым хрысціянінам, але гэта не закрэслівае агульнай змрочнай карціны ў абмалёўцы царквы. Аказваецца, што чалавек становіцца добрым хрысціянінам толькі пад страхам смерці.

Побач з Дон-Кіхотам яго спадарожнік Санча Панса. Прынята лічыць, што Санча Панса — гэта ўвасабленне практычнай смекалкі, адсутнасці ідэалаў. Думаецца, што гэта не так. Дон-Кіхот і Санча Панса — два бакі аднаго і таго ж медаля, гэта ўвасабленне двух бакоў грамадскага жыцця.

«Дон-Кіхот» — гэта не толькі крытыка рыцарскіх раманаў, арыстакратыі і царквы. «Дон-Кіхот» — гэта страсны заклік не адрывацца ад мас, умець слухаць і разумець масы, весці іх за сабой.

ФЛОРЭС-ФЕРДЫНАНДАС ХАСЭ-МАРЫЯ,
выкладчык Мінскага педагагічнага інстытута замежных моў.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

22 красавіка

Першая праграма. 11.00 — «На паклон да Ільіча». Рэпартаж з Краснай плошчы (М). 11.30 — «Песні пра Леніна». Фільм-канцэрт (М). 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15 — «Сяроўская быль». Тэлевізійны фільм. Перадача са Свярдлоўска. 12.35 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Пра Леніна — акцябратам» (М). 13.05 — для вучняў другой змены. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 16.15 — праграма перадач. 16.20 — для школьнікаў. «З Леніным у сэрцы». Фільм кінааматараў студыі «Юнацтва» Чавускага Дома піянераў. 16.40 — тэлевізійныя навіны. 17.00 — урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 96-й гадавіне з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Канцэрт (М). У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 20.30 — «За ўладу Саветаў». Адкрыццё народнага музея (М). 21.10 — «Родны горад Ільіча». Тэлевізійны фільм. (М). 21.30 — кінапанарама (М). 22.10 — лаўрэаты Ленінскай прэміі 1966 года (М).

Другая праграма. 19.30 — «Мы бачылі Леніна», «Пецярбургскія гады». Дакументальныя фільмы. 20.10 — «Сям'я Ульянавых». Мастацкі фільм.

23 красавіка

Першая праграма. 13.30 — праграма перадач. 13.35 — для юнацтва. А. Казапалянскі. «Пасажырскі білет». Прэм'ера тэлеспектакля (М). 14.15 — для малодшых школьнікаў. «Дом вясёлых дзяцей» (М). 15.00—для школьнікаў. Ю. Аляшкоўскі. «Воўкава навуковае адкрыццё». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 16.00 — для школьнікаў. «Дапытлівым». Навукова-папулярны альманах. 16.40 — тэлевізійныя навіны. 17.00 — клуб кінападарожнікаў (М). 18.00 — «Ленінскія лаўрэаты». Прэс-канферэнцыя з лаўрэатамі Ленінскай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі (М). 19.00 — тэлевізійныя навіны (М). 19.30 — «На агеньчык» (М). 20.45 — Э. Ранет. «Браканьеры». Спектакль Дзяржаўнага акадэмічнага Малога тэатра (М).

Другая праграма. 16.00 — тэлевізійныя навіны (М). 16.20 — «Шахматы». Тэлевізійны часопіс (М). 17.00—«Расказ пра Шаўчэнку». Навукова-папулярны фільм. 18.00 — суботні кінаэкран. 19.30 — канцэрт лаўрэата міжнародных конкурсаў Валерыя Клімава (скрыпка). 20.00 — рэклама, аб'явы. 20.10 — «Марш! Марш! Тра-та-та!» Мастацкі фільм. Дзецям да 16 год глядзець не дазваляецца.

24 красавіка

Першая праграма. 8.55 — у дапамогу завочнікам. 9.55 — праграма перадач. 10.00—«Будзільнік» (М). 10.30—для малышоў. «Месяц за месяцам». Красавік. 11.00 — «Глыбокая разведка». Успаміны ўдзельнікаў франтавой разведкі Мінскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 11.40 — «Музей-кватэра Ул. І. Леніна». Рэпартаж (М). 12.10 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Пра доблесць, пра подзвігі». Перадача з Ташкента. 13.00 — у свеце мастацтва. «Пражскі Крэмль». Перадача з Чэхаславакіі. 13.30 — школа ігры на баяне. (Урок восьмы). 14.00 — першынство СССР па футболу. «Дынама» (Мінск) — «Кайрат» (Алма-Ата). Кінарэпартаж. 14.30 — новыя кнігі. «Пра час і пра сябе». Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. 15.00 — «Мы сябруем з песняй». Расказ пра мужчынскі хор інтэрната Мінскага аўтазавода. 15.35— «Белыя і чорныя». Шахматна-шашачны клуб. Вядучы — міжнародны гросмайстар А. Суэцін. 16.00 — «Турнір дапытлівых». Каляндар-вікторына. 16.55 — «Святло і цені». Міжнародная праграма (М). 17.25 міжнародная таварыская сустрэча па футболу. СССР — Аўстрыя. Перадача з Вены. 19.10 — тэлевізійныя навіны (М). 19.30 — «Скачкі ў ваду». Перадача з Польшчы. 20.05 — «КВН-66». Перадача з Горкага. 22.00 — «Скрозь ледзяную імглу». Мастацкі фільм. 23.15 — першынство СССР па хакеі. ЦСКА — «Спартак». 3-ці перыяд (М).

Другая праграма. 10.30 — Здароўе» (М). 11.00 — для школьнікаў. «Аперацыя «Сірыус-2». Перадача з Ленінграда. 13.30 — «Музычны кіёск» (М). 14.00 для дзяцей. «Снежная каралева». Мультыплікацыйны фільм. 15.00 — тэлевізійныя навіны (М). 15.10 — «Сельскі клуб» (М). 16.00 — «Спявае пяшчотная яблынька». Канцэрт. Перадача з Адэсы. 20.00 — для веруючых і няверуючых. «Бездань». «Страчаныя гады». 20.40 — «Дняпроўскія зоркі». Фільм-канцэрт. 22.00 — «Пры спробе да ўцёкаў». Мастацкі фільм (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

АБ'ЯВА

Для работы ў Пінскім гарадскім Доме культуры і ў калектывах мастацкай самадзейнасці прадпрыемстваў горада Пінска патрабуюцца кваліфікаваныя кіраўнікі:

ХОРМАЙСТРЫ, БАЛЕТМАЙСТРЫ, ДЫРЫЖОРЫ, КАНЦЭРТМАЙСТРЫ

За даведкамі звяртацца па адрасу: г. Пінск, плошча Леніна, 1/39. Гарадскі аддзел культуры. Тэлефон № 29-82.

Прэзідыум, партыйная арганізацыя і прафсаюзная група Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку аддзела вытворчай работы і зарплаты Рэспубліканскага камітэта ЗАЙЦАВУ Аляксандру Рыгоравічу з выпадку напаткаўшага яго гора—смерці ЖОНКІ.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 01655